Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІСТАПАДА 2021 г. СУБОТА № 230 (29599)



АКЦЭНТЫ XXVII «ЛІСТАПАДА» 9

НЕАБМЕЖАВАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ПАРААЛІМПІЙЦАЎ 12



## КОРАТКА

• ДАІ ў выхадныя надасць павышаную ўвагу выкананню ПДР у цёмны час сутак.

• **Музейную экспазіцыю адкрылі ў аднаўленым сядзібным доме Напалеона Орды.**



• Вызначаны пераможцы акадэмічнага этапу праекта «100 ідэй для Беларусі».

• **Ільготы для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі ў адукацыі, курортным лячэнні: у Віцебску прайшоў тэлемост са Смаленскам.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Актыўнае ўкараненне тэхналогій штучнага інтэлекту, біяметрычнай ідэнтыфікацыі дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання паскараюць працэсы лічбавізацыі практычна ўсіх бакоў жыццядзейнасці чалавека і дзяржавы ў цэлым. Аднак развіццё інфармацыйных тэхналогій — не толькі дабро, але і пагроза, тут таксама ёсць адваротны бок. Гэта і фэйкі, з якімі мы не перастаём змагацца, і прамыя фінансавыя страты, магчымыя пры неасцярожных паводзінах у сецты, і кіберзлачыннасць, якая наносіць рэальны ўрон эканоміцы. Так, на працягу апошніх гадоў у Беларусі назіраецца ўстойлівы рост рэгістраваных кіберзлачынстваў: калі ў 2015 годзе было афіцыйна зарэгістравана больш як дзве тысячы такіх злачынстваў, то ў 2020-м — ужо больш за 25 тысяч».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «КАЛІ МЫ ЗАРАЗ НЕ ВЫРАШЫМ У БЕЛАРУСІ ПРАБЛЕМУ БЕЖАНЦАЎ, ЯНА БУДЗЕ НА ПАРАДАК МАГУТНЕЙШАЯ»

**Учора днём Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў у транспартна-лагістычны цэнтр каля пункта пропуска «Брузгі» беларуска-польскай граніцы. Некалькі тыдняў там месціцца больш за дзве тысячы бежанцаў, якія мяркуюць праз тэрыторыю Польшчы трапіць у Германію. Улады краіны, дабрачынныя арганізацыі і грамадскія супольнасці ладзяць быт мігрантаў. У пятніцу на ўласныя вочы пагладзець умовы жыцця бежанцаў прыехаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з умовамі размяшчэння бежанцаў, агледзеў пункт раздачы харчавання, пацікавіўся, ці ўсім хапае прадуктаў і месца ў цэнтры. Праінфармавалі яго аб мерах супрацьпажарнай бяспекі. Кіраўнік дзяржавы таксама сустрэўся з прадстаўнікамі Чырвонага Крыжа і паразмаўляў з бежанцамі, якія не пакідаюць надзеі трапіць у краіны Еўрапейскага саюза. Мігранты сустрэлі Прэзідэнта апладысментамі.**



Фота БелТА.

## Па-за кампетэнцыяй нашай краіны

На імправізаванай трыбуне з драўляных паддонаў Прэзідэнт пачаў размову з бежанцамі, адзначыўшы сваю ўпэўненасць у вырашэнні крызісу на граніцы. Ён расказаў, што яго задача — дапамагчы людзям, якія трапілі ў бяду. Па яго словах, палова інфармацыі, што прыходзіць да мігрантаў, — фэйкі, няпраўда. Таму яго парада: «Вам трэба, знаходзячыся тут, навучыцца адрозніваць праўду ад няпраўды».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на яго сустрэчы з бежанцамі прысутнічаюць прадстаўнікі заходняй супольнасці, журналісты. «Няхай яны ведаюць, што мы, беларусы, і я ў тым ліку як Прэзідэнт Беларусі, будзем рабіць усё так, як вы пажадаеце, нават калі гэта будзе дрэнна для палякаў, латышоў і яшчэ кагосьці. Мы будзем рабіць так, як вы захочаце», — цытуе словы Прэзідэнта яго прэс-служба.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што дапамагчы бежанцам трапіць у Германію — па-за кампетэнцыяй нашай краіны. «Вы разумееце, што мы не можам зладзіць вайну, каб прабіць вам калідор праз Польшчу да Германіі. Вы бачыце, як яны рэагавалі, калі вы падышлі бліжэй да іх. Яны вас сустрэлі ядахімікатамі, святлошумавымі гранатамі, слёзатачывым газам і гэтак далей. Не дай бог, пайшлі б далей да граніцы, пачалі б страляць. Людзі з таго боку ашалелі», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

## Шляхі: дадому ці ў Еўропу

Аляксандр Лукашэнка расказаў пра сваё абяцанне еўрапейцам — рабіць усё, каб мігранты, тыя, хто жадае, маглі вярнуцца да сябе на радзіму. Таксама Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь не будзе рабіць палітыку на лёсах бежанцаў і паабяцаў, што мігрантаў гвалтоўна не будуць эвакуіраваць дамоў. «Калі вы захочаце ісці ў заходнім напрамку, мы не будзем вас душыць, хапаць і збіваць. Гэта ваша воля. Пройдзеце — ідзіце. Вось і ўся філасофія. Я ведаю, што сказанае мной не ўсім спадабаецца, асабліва за мяжой, але гэта праўда, яны павінны ведаць праўду», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што, па даных палякаў, на тэрыторыю Польшчы, Літвы, Латвіі штодня праходзіць да 200 чалавек. Прэзідэнт агучыў даныя і аб тым, што за апошнія суткі праз граніцу Беларусі на тэрыторыю Польшчы і Літвы пайшло прыкладна 200 чалавек. «Гэта людзі, якія знаходзіліся ў Мінску, Гродне, жылі на прыватных кватэрах. З вашага лагера, магчыма, 10 чалавек», — растлумачыў ён.

Па падліках беларускага боку на тэрыторыі нашай краіны, акрамя двухтысячнага лагера, у Гродзенскім раёне знаходзіцца яшчэ каля 2-3 тысяч бежанцаў з краін Блізкага Усходу. Але гэта, падкрэсліве Прэзідэнт, вельмі прыблізныя лічбы. Ён адзначыў, што бежанцы з Афганістана будуць спрабаваць трапіць у ЕС праз Украіну. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэта пытанне зараз хвалюе беларускі бок. Каб супрацьстаяць мігрантам, украінцы нарошчваюць на граніцы пазіцыі сілавікоў.

СТАР. 2

Розныя — роўныя

# КАБ РАЗУМЕЦЬ АДНО АДНАГО

## «Ясная мова» — яшчэ адзін крок да інклюзіі

**Каця любіць бываць сярод людзей... і ласавацца цукеркамі. Яна ўжо паўналетняя і наведвае аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў з цяжкімі і шматлікімі парушэннямі ТЦСАН Маскоўскага раёна Мінска. Нягледзячы на тое, што дзяўчына не здольная выкарыстоўваць мову для паўнавартасных зносін, яна лёгка знаходзіць агульную мову з супрацоўнікамі Цэнтра з дапамогай альтэрнатыўных спосабаў камунікацыі — піктаграм. Гэта такія знакі, якія адлюстроўваюць найважнейшыя рысы любога аб'екта, прадмета або з'явы, часцей за ўсё ў схематычным выглядзе.**

СТАР. 5



**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы**

ISSN 1990 — 763X

21230>

9 771990 763008

# «КАЛІ МЫ ЗАРАЗ НЕ ВЫРАШЫМ У БЕЛАРУСІ ПРАБЛЕМУ БЕЖАНЦАЎ, ЯНА БУДЗЕ НА ПАРАДАК МАГУТНЕЙШАЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь жа, паводле слоў Прэзідэнта, не будзе чыніць перашкод бежанцам на іх шляху ў Еўрасаюз. Аляксандр Лукашэнка заклікаў мігрантаў вырашыць для сябе, як ім лепш: або вярнуцца дадому, або цярпець нягоды і нязручнасці, каб паспрабаваць трапіць у ЕС.

«Падумайце. Адзінае, што скажу: лепш, на жаль, пакуль не будзе. Мы нічога не станем рабіць сілком. Я вам абяцаю: усё, што я і органы дзяржаўнай улады Беларусі можам зрабіць, мы зробім. Мы настойліва будзем прасіць заходнія дзяржавы вам дапамагчы. Гэта не толькі чалавечая праблема, я гляджу далей: калі мы зараз не вырашым у Беларусі праблему бежанцаў, яна будзе на парадак магутнейшая не толькі вясной, але і зімой. Мы разумеем, што сюды хлыне вялікая колькасць бежанцаў, і стрымаць іх на граніцы будзе немагчыма», — цытуе словы кіраўніка дзяржавы яго прэс-служба.

## Зварот да народаў Польшчы і Германіі

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што вырашаць міграцыйную праблему трэба зараз, пакуль яна не разраслася, і заклікаў польскі бок прапусціць бежанцаў у Германію. Аляксандр Лукашэнка сказаў народу Польшчы: «Паважаныя палякі, прывядзіце да розуму сваіх палітыкаў. Вы ж разумееце, што за кошт гэтых бяздольных людзей яны хочуць вырашыць свае ўнутраныя і знешнія праблемы». На яго думку, кіраўніцтва Польшчы разлічвае вытаргаваць мільярды еўра ў Еўрапейскага саюза, які заблакіраваў гэту дапамогу з-за рознагалоссяў з краінай.

«Палякі незадаволеныя палітыкай кіруючай кааліцыі, і яны ўсё больш прад'яўляюць патрабаванняў свайму ўраду. І каб адцягнуць увагу ад гэтых праблем, яны (улады Польшчы. — **«Зв.»**) арганізавалі гэту бойню на граніцы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён таксама заклікаў народ Германіі даць прытулак бежанцам з беларуска-польскай граніцы, якія хочуць уз'яднаць свае сем'і, знайсці сваіх родных і блізкіх, што знаходзяцца ў Германіі. «Гэта невялікая нагрузка, яны хочуць жыць у Германіі. Дзве тысячы чалавек — не вялікая праблема для Германіі. І канцлер Меркель з гэтым пагадзілася», — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка.

## Каб побыт быў лягчэйшы

У лагеры бежанцаў кругламі суткамі працуюць прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, валанцёры гуманітарных місій, а таксама беларускія чыноўнікі і сілавікі. Аляксандр Лукашэнка заклікаў бежанцаў пры неабходнасці звяртацца да іх па дапамогу і не баяцца беларускіх ваенных, якім даручана гарантаваць бяспеку ў лагеры.

«Мы будзем старацца забяспечыць вас харчаваннем, апрануць. Мы будзем рабіць усё для таго, каб вы атрымалі пітную ваду, каб вы маглі адвесці ў лазню дзетак, каб жонкі вашы маглі схадзіць у лазню і вы. Мы будзем рабіць усё, каб зрабіць ваш часовы побыт крыху лягчэйшым», — запэўніў Прэзідэнт бежанцаў.

У час размовы з кіраўніком дзяржавы людзі выказалі падзяку беларускаму народу і кіраўніцтву краіны за аказаную падтрымку і дапамогу, асабліва за клопат аб іх дзецях.

## Хто маўчыць, а хто заказвае «музыку»

Пасля размовы з бежанцамі Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з журналістамі. Ён расказаў, што ў першай размове з в. а. канцлера Германіі Ангелай Меркель папрасіў забраць больш за дзве тысячы чалавек, якія знаходзяцца на граніцы з Польшчай. «Па размове з Меркель я зразумеў, што яна выдатна разумее гэта і яна не супраць. Натуральна, яна чалавек, які сыходзіць, яе паўнамоцтвы практычна скончыліся. І другое — еўрапейская салідарнасць. Яна мяне папрасіла, адпаведна, адправіць на радзіму тых, хто ў нас ёсць. Я сказаў, што мы будзем над гэтым працаваць. І двойчы ёй паўтарыў: мы пастараемся да новага года гэту праблему вырашыць. Мы не будзем іх рэпатрыіраваць. Мы папросім, каб з'ехалі тыя, хто хоча», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго, абавязацельствы выконваюцца: ужо больш як 1 тысяча чалавек паехала, 400 яшчэ знаходзяцца ў аэрапорце. Падчас другой размовы Ангела Меркель сказала, што праблема бежанцаў на граніцы будзе вырашацца на ўзроўні ЕС, дамовіліся вызначыць кантактных асоб для гэтай работы. «Яна кажа: «Вось гэтыя людзі ўжо на ўзроўні ЕС вырашаць гэтую праблему». Я даручыў міністру замежных спраў, ён назаўтра патэлефанаваў. Адказ: «Ды нам зараз не да гэтага, у нас камандзіроўкі». Відаць, не жадаюць вырашаць гэтую праблему. Сутнасць у чым: не жадаеце вырашаць — скажыце, мы без вас будзем вырашаць гэтую праблему!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніку ён канстатаваў, што з боку ЕС у вырашэнні праблемы бежанцаў воз і зараз там. Ён таксама падкрэсліў: «Яны не хочуць вырашаць гэту праблему нават па тых напрамках, дзе яе можна вырашыць. Ну што такое Чырвонаму Крыжу дапамагчы нейкімі грашыма або Міністэрству аховы здароўя дапамагчы праляЧыць гэтых людзей... Тут жа хворых людзей шмат... А пачнецца зіма, а, не дай бог, пандэмія і іншае, іншае! Што, яны гэтага не разумеюць? Прыехалі, пакрасаваліся тут, з'ехалі — цішыня».

Ён таксама адзначыў, што Еўропе вайна і канфлікты не патрэбны, гэта трэба амерыканцам. «Ім трэба тут заварыць кашу чужымі рукамі», — сказаў Прэзідэнт.

Журналісты пацікавіліся меркаваннем кіраўніка дзяржавы, чаму некаторыя прадстаўнікі Захаду, міжнародных арганізацый практычна не ідуць на кантакт з журналістамі.

«Яны прыязджаюць для таго, каб вам тры словы ляпнуць, і для таго, каб прапіярыцца. Вы майце на ўвазе, што яны атрымліваюць месячную зарплату столькі, колькі мы ўсе з вамі, і я ў тым ліку, атрымліваем за месяц, — адзначыў Прэзідэнт. — Якія з імі могуць быць размовы і перагаворы? Гэта людзі пустыя. Тыя, хто плаціць ім зарплату, а ў асноўным там амерыканцы, еўрапейцы і іншыя, яны і музыку заказваюць».

Аляксандр Лукашэнка расказаў пра перахопленае паведамленне заходнім палітыкам: не размаўляць з журналістамі, асабліва беларускімі і расійскімі. «Таму што яны, калі сюды прыязджаюць, вы за імі бегаеце: «Скажыце гэта, скажыце тое...» Яны ў дзікую сітуацыю трапляюць, не ведаючы, што рабіць», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка краіны, выдаткаваная на дапамогу бежанцам ужо $12,6 млн. «Яны Чырвонаму Крыжу нашаму пералічылі $260 тысяч, — заўважыў ён. — Разумееце, такія мярзотныя. Не хочуць — не трэба, мы разбяромся з гэтымі людзьмі. Але іх абараніць (Захад і Еўропу ў прыватнасці. — **«Зв».**) мы не будзем. Яны першымі парушылі нашы дагаворы аб рэадмісіі».

Аляксандру Лукашэнку таксама было зададзена пытанне адносна новага ўрада Германіі. «Мы ні на што не разлічваем, але мы робім усё як нармальныя людзі, цывілізаваныя суседзі. Мы не хочам ніякай вайны, супрацьстаяння тут, у цэнтры Еўропы. Калі яны прытрымліваюцца гэтай лініі, калі ласка, будзем заўтра сустракацца і дамаўляцца. Калі яны хочуць канфрантацыі, думаю, яны ад гэтага толькі страцяць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

# ПАТРЭБНАЯ ДАПАМОГА

## Рэгіянальны офіс СААЗ перадаў Чырвонаму Крыжу гуманітарны груз для бежанцаў

**У агульным аб'ёме пастаўка важыць больш за тону. Гэта медыцынскія модулі з расходнымі медыцынскімі матэрыяламі і лекамі.**

Як расказаў журналістам **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК**, гэта дапамога бежанцам, якія зараз знаходзяцца ў транспартна-лагістычным цэнтры «Брэміна-Брузгі» на беларуска-польскай граніцы. Паводле яго слоў, аснову грузу складаюць медыкаменты, перавязачны матэрыял, абсталяванне для аказання дапамогі ў надзвычайных сітуацыях. Сродкі выкарыстоўваюцца для лячэння найбольш частых неінфекцыйных захворванняў. У складзе гуманітарнага грузу — антыбактэрыяльныя, гарачкапаніжальныя, гіпатэнзіўныя, супрацьгрыбковыя, антысептычныя і іншыя прэпараты. У ліку іншага перададзены медыцынскія інструменты, глюкометры, тэрмометры, атаскопы, танометры і гэтак далей.

Як патлумачыла **першы намеснік генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Іна ЛЕМЯШЭЎСКАЯ**, зараз гуманітарны груз павінен прайсці абавязковую працэдуру рэгістрацыі, у афармленні ўсіх неабходных для гэтага дакументаў задзейнічаюць валанцёраў з ліку будучых фармацэўтаў.



У сваю чаргу **каардынатар праграм СААЗ па інфекцыйных захворваннях краінавага офіса СААЗ у Беларусі Вячаслаў ГРАНЬКОЎ** патлумачыў, што, разумеючы ўсю складанасць сітуацыі на беларуска-польскай граніцы, гуманітарны груз сабралі вельмі хутка. Яго мяркуюць перадаць як у шпіталі, дзе лечацца бежанцы, так і непасрэдна ў лагер, дзе арганізавана дзейнасць медыцынскага пункта.

Дарэчы, як патлумачылі ў прэсслужбе Міністэрства аховы здароўя, перададзеная колькасць медыкаментаў і матэрыялаў разлічана на аказанне дапамогі ў сярэднім 10 тысяч чалавек на працягу трох месяцаў. Атрымальнік гуманітарнай дапамогі ў Беларусі — Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота Рамана КЛЮЧЫНА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ПАР працягнулі рэжым агульнанацыянальнага бедства



Урад Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі працягнуў да 16 снежня дзеянне рэжыму агульнанацыянальнага бедства, які быў уведзены ў сакавіку мінулага года ў сувязі з пандэміяй каранавіруса. Пра гэта аб'явіў міністр у канцылярыі прэзідэнта ПАР Мондлі Гунгубеле. «Захады, якія прымаюцца, будуць садзейнічаць барацьбе з каранавірусам і дадуць магчымасць абараніць грамадзян краіны», — заявіў ён у выступленні, якое транслявалася на ўрадавым партале. Гэты рэжым дазваляе ўладам уводзіць абмежавальныя меры, уключаючы поўны каранцін і забарону на перамяшчэнне без спецыяльнага дазволу. Абвяшчэнне аб падаўжэнні рэжыму агульнанацыянальнага бедства супала з паведамленнем Нацыянальнага інстытута інфекцыйных хвароб ПАР аб з'яўленні на тэрыторыі краіны новага штама каранавіруса, які валодае павышанай ступенню мутацыі. Ён упершыню быў выяўлены нядаўна ў суседняй Батсване.

## У Кыргызстане спынілі спробу гвалтоўнага захопу ўлады

«У ходзе праверкі Дзяржкамітэта нацбяспекі (ДКНБ) і МУС былі атрыманы даныя аб групе асоб, якія плануюць арганізацыю правакацый дэстабілізацыі грамадска-палітычнай абстаноўкі ў краіне адразу пасля выбараў, з наступным гвалтоўным захопам улады», — паведамілі ў ДКНБ. Стала вядома, што пасля абвяшчэння вынікаў дадзеная злачынная група планавала арганізаваць масавыя акцыі пратэсту на тэрыторыі Бішкека з наступным абвастрэннем сітуацыі, правакацыяй сутыкненняў з сіламі правапарадку і далейшым гвалтоўным захопам улады. Падчас расследаванняў былі атрыманы неабвержныя доказы, што ініцыятарамі і кіраўнікамі плана захопу ўлады з'яўляюцца былыя высокапастаўленыя чыноўнікі. Следчымі акрамя дакументальных матэрыялаў, якія пацвярджаюць падрыхтоўку да злачынства, знойдзены і канфіскаваны агнястрэльная зброя, боепрыпасы і наркатычныя сродкі. Затрыманы і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 15 актыўных членаў злачыннай групы.

## Для брытанскіх аўтавытворцаў кастрычнік стаў найгоршым за 65 гадоў

Выпуск аўтамабіляў у Вялікабрытаніі ў кастрычніку ўпаў на 41,4 працэнта ў гадавым выражэнні з-за глабальнага дэфіцыту чыпаў. У мінулым месяцы ў краіне было выпушчана 64 729 машын у параўнанні са 110 458 у такі ж час летась. Аб гэтым сведчаць звесткі Таварыства вытворцаў і прадаўцоў аўтамабіляў (Society of Motor Manufacturers and Traders, SMMT). Гэта найгоршы паказчык для гэтага месяца з 1956 года. Прычым зніжэнне вытворчасці было зафіксавана па выніках чацвёртага месяца запар, адзначаецца ў паведамленні SMMT. «Гэтыя лічбы выклікаюць крайнюю трывогу і паказваюць, наколькі моцна недахоп паўправаднікоў у свеце адбіваецца на брытанскіх вытворцах аўтамабіляў і іх пастаўшчыках», — заявіў галоўны выканаўчы дырэктар SMMT Майк Хоўз.

Парламенцкі дзённік

# РАЗАМ СУПРАЦЬ ЗНЕШНІХ ВЫКЛІКАЎ

**Падчас пасяджэння Наталля КАЧАНАВА праінфармавала членаў Савета аб ходзе рэалізацыі старшынства Рэспублікі Беларусь у СНД у 2021 годзе. У сваім выступленні спікер верхняй палаты парламента сказала, што ў рамках беларускага старшынства, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, асноўныя мерапрыемствы вышэйшага і высокага ўзроўняў былі праведзены своечасова, былі прыняты важныя рашэнні і дасягнуты прынцыповыя дамоўленасці.**

Паводле слоў спікера верхняй палаты беларускага парламента, далейшае ўмацаванне СНД, пашырэнне ўзаемадзеяння ва ўсіх магчымых фарматах, узаемная падтрымка на міжнародных пляцоўках дапамогуць справіцца з рызыкамі і пагрозамі нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі. Толькі сумеснай, зладжанай працай усіх дзяржаў і структур СНД можна дасягнуць пастаўленых мэт.

На думку Наталлі Качанавай, неабходна ўзаемная падтрымка партнёраў па Садружнасці пры адстойванні прынцыповай пазіцыі і агульных падыходаў ва ўмовах знешняга ціску, нядобрасумленнай канкурэнцыі, прадузятых адносін, эканамічных і палітычных абмежаванняў. У сваім выступленні яна акцэнтавала ўвагу на тым, што, на жаль, работа парламентарыяў праходзіць у максімальна неспрыяльных знешніх умовах. Яна прывяла ў прыклад Беларусь, якая сутыкнулася з беспрэцэдэнтным палітычным і эканамічным націскам, нахабным і цынічным умяшаннем знешніх сіл у справы суверэннай дзяржавы.

Паводле слоў Старшыні Савета Рэспублікі, спробы дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі не спыняюцца, становяцца ўсё больш дзёрзкімі. Радыкалізацыя нарастае — ад правакацыі з самалётам да эскалацыі міграцыйнага крызісу на граніцы. Разгорнута маштабная інтэнсіўная гібрыдная вайна, якая сёння пагражае бяспецы ўсяго рэгіёна і можа, калі не прыняць адпаведных мер, перарасці ў гарачую форму супрацьстаяння, папярэдзіла калег Наталля Качанава.

У такой сітуацыі вельмі важна атрымліваць падтрымку сяброў і партнёраў, дэманстраваць прынцыповасць, адстойваць агульныя падыходы ў Садружнасці, падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. Карацей, надышоў час разам супрацьстаяць знешнім выклікам.

Члены Савета падвялі вынікі праведзеных сёлета дзявятага Неўскага міжнароднага экалагічнага кангрэса, трэцяга Еўразійскага жаночага форуму, шостага міжнароднага культурна-адукацыйнага форуму дзяржаў — удзельніц СНД «Дзеці Садружнасці». Таксама былі абмеркаваны ход падрыхтоўкі да Сусветнай канферэнцыі па міжкультурным і міжрэлігійным дыялогу. Мерапрыемства арганізоўваецца Міжпарламенцкім саюзам у супрацоўніцтве з ААН. Нагадаем, канферэнцыя запланавана на май будучага года і пройдзе ў Санкт-Пецярбургу, на яе мяркуецца запрасіць кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, кіраўнікоў парламентаў і рэлігійных дзеячаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і моладзі.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

# РЭАЛЬНАЯ ПАГРОЗА ЎЗБРОЕНАГА КАНФЛІКТУ

**Аб гэтым учора заявіла кіраўнік парламенцкай дэлегацыі Беларусі на 53-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (МПА СНД) Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**



Фота БелТА.

Яна скарысталася магчымасцю данесці да сваіх калег заклапочанасць кіраўніцтва краіны выбухованебяспечнай сітуацыяй на граніцы Беларусі і Польшчы і выступіла з заявай па актуальнай тэме. Мэта заявы — паведаміць сусветнай супольнасці пра нашу пазіцыю і разлік на тое, што Беларусь будзе пачутая.

Наталля Качанава выказалася аб сапраўдных прычынах крызісу на граніцы: «Людзі ўцякаюць ад вайны і галечы з краін Блізкага Усходу ў дзяржавы Еўрапейскага саюза. Ім еўрапейцамі было абяцана лепшае жыццё». А тым часам грамадзяне Беларусі, сенатары, дэпутацкі корпус, грамадскія арганізацыі абураны прадузятым стаўленнем да Беларусі з боку еўрапейскіх краін.

У заяве яна адзначыла, што беларускія ўлады неаднаразова звярталіся ва ўсе еўрапейскія арганізацыі, да сваіх калег, дэпутатаў. Але, на жаль, там іх не вельмі чуюць. Наталля Качанава прызналася, што ў Мінску з вялікай занепакоенасцю даведаліся аб уключэнні ў праект парадку дня 143-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза ў Мадрыдзе надзвычайнага пункта на тэму «Стрыманне гандлю людзьмі, спыненне парушэнняў правоў чалавека і работа ў напрамку свабодных і сумленных выбараў у Беларусі». Гэта ініцыятыва належыць дэлегацыям Германіі, Латвіі, Нідэрландаў і Польшчы.

Па ацэнцы Старшыні Савета Рэспублікі сітуацыя на беларуска-польскай граніцы здольная прывесці да ўзброенага канфлікту. Гэты міграцыйны крызіс — брудная, несумленная палітыка захаду, якая накіравана на вырашэнне нейкіх сваіх палітычных пытанняў, зрабіла высновы Старшыня Савета Рэспублікі.

Гэта заява знайшла водгук у сэрцах парламентарыяў дзяржаў СНД. У прыватнасці, Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Матвіенка выказала словы падтрымкі Беларусі. Яна адзначыла, што Расія гатовая аказаць любую дапамогу для вырашэння праблемы бежанцаў на беларуска-польскай граніцы. Але, на яе думку, для нармалізацыі гэтай сітуацыі патрэбны палітычныя рашэнні. Бо гэта пытанне не толькі Беларусі і не столькі Беларусі. Павінны быць прыняты палітычныя рашэнні ў Еўрасаюзе, куды гэтыя бежанцы імкнуцца па лепшае жыццё.

Трэба сказаць, што гэта «беларускае пытанне» не значылася ў парадку дня пленарнага пасяджэння. Але на ім спецыяльна засяродзілі ўвагу, бо яно сёння мае выключнае значэнне для нашай краіны.

Акрамя гэтага, парламентарыі разгледзелі 14 пытанняў. Напрыклад, прынялі сумесную заяву МПА СНД, Рэгіянальнага бюро Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Вене і Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя «Аб мерах заканадаўчага забеспячэння працоўнай міграцыі ў перыяд пандэміі», у якой прапануюцца ўніверсальныя меры і гарантыі для працоўных-мігрантаў у галіне сацыяльнай абароны і аховы здароўя.

У ходзе пасяджэння таксама былі разгледжаны мадэльныя законы «Аб роўным доступе да прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння ВІЧ-інфекцыі ў краінах СНД», «Аб донарстве органаў», «Аб ацэначнай дзейнасці».

**Леанід ТУГАРЫН.**

Блізкая ўлада

# «РАДУЕ, ШТО ПЫТАННЯЎ СТАНОВІЦЦА МЕНШ...»

## Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ правёў прыём грамадзян у Слаўгарадскім раёне

**Палітычны штаб, як назваў сваю Адміністрацыю кіраўнік дзяржавы, працягвае маніторыць стан спраў у рэгіёнах, у тым ліку праз асабістыя сустрэчы з жыхарамі. Гэтым разам да першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі запісаліся сем чалавек непасрэдна са Слаўгарада і раёна, а таксама жыхары Магілёўскага і Бялыніцкага раёнаў.**



Заяўніца з райцэнтра звярнулася з просьбай, каб васьмікватэрны дом, у якім яна жыве, не зносілі. Дом прызнаны непрыдатным, і паўстала пытанне або зносу яго, або рабіць капрамонт і перасяляць жыльцоў у арэнднае жыллё. Жанчына аргументуе, што дом знаходзіцца ў вельмі зручным для яе месцы і яна не жадае нікуды пераязджаць. **Старшыня райвыканкама Сяргей МІХАЛЮТА** паведаміў, што пытанне «зносіць або рамантаваць» стаіць па трох дамах. На капрамонт спатрэбіцца прыкладна два мільёны беларускіх рублёў, без дапамогі вобласці датацыйнаму раёну не абысціся. Другі варыянт таксама не танны. Бо ў выпадку зносу прыйдзецца даць арэнднае жыллё жыхарам 40 кватэр. У Слаўгарадзе ж арэнднага жылля наогул няма.

Максім Рыжанкоў паабяцаў, што пахадайнічае перад аблвыканкамам, каб дапамаглі з фінансаваннем капрамонту. Па словах Сяргея Міхалюты, капрамонт рэальна зрабіць за летні перыяд. На гэты час жыхарам будзе дадзена часовае жыллё.

Віталій Васільевіч жыве ў аграгарадку Васькавічы Слаўгарадскага раёна з 2013 года. Увесь гэты час ён стаіць на чарзе на жыллё ў Васькавіцкім сельсавеце і ніяк не можа справіць наваселле. Сёння ён на чарзе дванаццаты. Мужчына пенсіянер, і яго турбуе, што з такімі тэмпамі выдзялення жылля ён яго не дачакаецца. На прыёме высветлілася, што вызваліўся дом у суседняй вёсцы. Калі іншыя саіскальнікі, якія стаяць перад ім у чарзе, адмовяцца туды пераязджаць, ён зможа засяліцца хоць сёння.

Мужчына таксама паскардзіўся на тое, што ў яго праблемы з атрыманнем пенсіі. Ён — грамадзянін Расіі, і ўзніклі складанасці з яе афармленнем. Яно вельмі зацягваецца, і жыць няма на што, скардзіцца мужчына. Максім Уладзіміравіч паабяцаў садзейнічанне з падрыхтоўкай дакументаў праз расійскае пасольства.

У цяжкую сітуацыю трапіла жыхарка вёскі Новая Слабада. Яна выступіла паручыцелем у суседкі, якая ўзяла крэдыт. Хутка высветлілася, што суседка крэдыт не выплачвала, і ўсе абавязацельствы па выплатах ляглі на паручыцеля. Заяўніца выплаціла крэдыт з працэнтамі, а зараз спрабуе спагнаць гэтыя грошы з вінаватай. Складанасць у тым, што тая ўжо пяць гадоў нідзе не працуе і на яе ўтрыманні знаходзіцца непаўналетняя дзіця. Пытанне ўзята на кантроль.

Кіраўніца жыллёва-будаўнічага кааператыва прыйшла на прыём ад імя жыхароў 40-кватэрнага дома. На абслугоўванні дома знаходзіцца вялікая тэрыторыя, і ўзніклі праблемы з яе асфальтаваннем, паколькі для жыхароў гэта дорага. Яна не ведала, што ў райвыканкаме гэта пытанне ўжо вырашылі, прычым станоўча для жыхароў.

А вось для таго, каб унікнуць у сітуацыю індывідуальнай прадпрымальніцы, якая паскардзілася на няякасную пракладку водаадводнай канавы каля яе ўчастка, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта нават выехаў на месца. Высветлілася, што пад'езд да дома заяўніцы сапраўды пагоршыўся. Трэба будзе панізіць бардзюр і скарэкціраваць пад'езд.

Усе пытанні, з якімі звярнуліся жыхары трох раёнаў, на кантролі, заяўнікі атрымаюць адказы ва ўстаноўленыя законам тэрміны. Максім Рыжанкоў паабяцаў заяўніцы з Бялыніцкага раёна асабіста наведаць яе праблемны аб'ект. Жанчына неаднаразова звярталася да мясцовых улад, у тым ліку прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, але пытанне дагэтуль не вырашана. Праблема ў тым, што пясок з дарогі пастаянна змываецца на яе ўчастак і засмечвае яго.

Падсумоўваючы вынікі прыёму грамадзян, Максім Рыжанкоў выказаў задаволенасць тым, што колькасць зваротаў паступова зніжаецца. Характар пытанняў паказвае, што заяўнікі або не дайшлі да старшыні райвыканкама, або гэтыя пытанні знаходзяцца ў кампетэнцыі абласных ці рэспубліканскіх органаў улады. «Як наконт аварыйных дамоў у Слаўгарадзе — пра фінансаванне іх рамонту буду размаўляць з губернатарам. Галоўнае — людзі абазначылі праблему, а ўлады ўжо будуць думаць, як яе вырашаць», — удакладніў ён.

Пасля прыёму грамадзян Максім Рыжанкоў наведаў у Слаўгарадзе філіял холдынга «Бабушкина крынка» і філіял бабруйскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад». Размаўляючы з журналістамі, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што атрымаў вельмі добрыя ўражанні ад наведвання раёна.

— Прыемна ўразілі новыя вытворчасці, трэба і іншым нашым моцным прадпрыемствам браць прыклад з таго ж «Чырвонага харчавіка» і ісці падымаць эканоміку ў малыя гарады. Знамянальна, што тут ствараецца высакаякасная прадукцыя, якая запатрабавана за мяжой, а сярэдняя зарплата дасягае амаль 900 рублёў. І гэта пры тым, што прадпрыемства яшчэ не запрацавала на поўную магутнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**
*г. Слаўгарад.*

# Камароўка ідзе ў зіму

## Але гандаль не спыняецца: што і пачым можна набыць сёння на знакамітым рынку

Камароўка — адзін з ключавых аб'ектаў сезоннага і пазасезоннага гандлю прадуктамі харчавання ў Мінску: у звычайныя дні тут бывае 30 тысяч пакупнікоў, а перад святамі па прадукты прыходзіць да 80 тысяч чалавек. У наступным годзе рынак адсвяткуе свой 40-гадовы юбілей.

На 32 пунктах прадукцыю прадстаўляюць беларускія заводы. Дарэчы, усе тавары паступаюць на Камароўку выключна пасля лабараторнага кантролю, а для хатняй і лясной прадукцыі прадугледжаны і радыялагічны кантроль.

З нядаўніх часоў на рынку таксама даступная прадукцыя ад фізічных асоб — духмяная выпечка, вэнджаніна, арахісавая паста, зефір і прысмакі хатняй вытворчасці.

— На наступным тыдні ў першым сектары сезоннага рынку запрацуе навагодні кірмаш, будуць прадавацца святочныя гірлянды, серпанцін, цацкі, сувенірная прадукцыя, — дзеліцца навінамі **начальнік аддзела сацыяльнага развіцця рынку Іван ТКАЧУК.** — Мы ўжо пачалі ўпрыгожваць тэрыторыю да свята, а завершым гэты працэс да 1 снежня.

Іван Ткачук звяртае ўвагу на сяміметровую ёлку, якая красуецца над цэнтральным уваходам у крытым павільёне. А ўсяго на рынку і прылеглай тэрыторыі з'явіцца каля 35 навагодніх дрэў. Каля радыёвузла па традыцыі ўсталююць вялікага надзіманага снегавіка. Маляўнічая кампазіцыя ўпрыгожыць зону каля фантана.

Навагоднее ўбранне — толькі частка падрыхтоўкі да зімовага сезона.

— Будзе арганізавана 10 пляцовак для продажу навагодніх дрэў — у кадках і свежазрэзаных. У нас штогод прадугледжана такая колькасць месцаў, і яны запатрабаваныя, ёсць пастаянныя арандатары, якія ўжо дзясятак гадоў гандлююць гэтай прадукцыяй, — распавядае **начальнік службы арганізацыі рынкавага гандлю Анжэла БАРАНОВІЧ.** — Продажы жывых елак стартуюць 17 снежня.

Анжэла Барановіч дзеліцца і іншымі навінамі:

— Напярэдадні зімовага часу мы прадугледжваем размяшчэнне прадаўцоў з сезоннага рынку ў купальнай частцы і ў адміністрацыйна-гаспадарчым комплексе, дзе ўжо стаяць дадатковыя сталы. Туды з надыходам халадоў пераедуць пункты з садавінай і гароднінай.

На пытанне аб тым, наколькі ўзрастае паток пакупнікоў у перадначавагодія тыдні, работнікі адказваюць: раз у 10, а напярэдадні свят сярэднядзённую колькасць наведвальнікаў можна памнажаць на 100.

Так што хутка пачнуцца гарачыя дзянькі. Ну а пакуль Камароўка жыве звычайным жыццём. З павеваў апошняга часу — аб'ява каля ўвахода аб рабоце пункта вакцынацыі. Дарэчы, адкрыты ён быў яшчэ ў маі. Зараз рэжым работы здраўпункта, дзе можна прышчапіцца адной з трох вакцын, такі: з аўторка да пятніцы — з 10.00 да 18.00, у суботу і нядзелю — з 10.00 да 15.00. Зазіраем унутр. Як расказвае лекар, з мая тут прышчапіліся больш за 4 тысячы чалавек, апошнім часам попыт на вакцынацыю павялічыўся, у сярэднім у дзень сюды прыходзіць да 50 чалавек. З сабой трэба мець толькі пашпарт і, вядома, быць здаровым.

Абыходзячы рынак, мы не маглі не зазірнуць у лабараторыю ветэрынарна-санітарнай экспертызы.

— Правяраем прадукцыю на ўтрыманне радыенуклідаў і нітратаў, таксама праводзім комплексную ветсанэкспертызу такога мяса, як трус, птушка, бараніна, і ветагляд мяса, якое паступае ад заводаў, — тлумачыць **начальнік лабараторыі Кацярына ДУБІКОЎСКАЯ.**

У адным з памяшканняў спецыялісты, як на кухні, робяць нарыхтоўкі: здрабняюць гародніну, якую трэба праверыць на нітраты. Далей нарыхтоўка праходзіць яшчэ шэраг працэдур, перш чым трапіць на замеры.

— Калі проба перавышае дапушчальныя значэнні, партыя тавару адбіраецца і ўтылізуецца. Калі прадукцыя чыстая, то выдаюцца дазвалельныя талоны і можна гандляваць, — тлумачаць у лабараторыі.

— Сёлета намі праверана 163 тысячы партый, гэта 53 тысячы тон прадукцыі. Не выпушчана ў продаж 360 партый (каля 3 тон), — распавядае Кацярына Дубікоўская. — У тым ліку па нітратах перавышэнне было ў сямі выпадках (127 кілаграмаў не пайшло ў продаж), не прайшлі кантроль па радыенуклідах 23 кілаграмаў грыбоў і 74 кілаграмаў ягад. Гэты тавар быў утылізаваны.

і садавіной. Пачым цяпер прапануюць набыць сезонную прадукцыю, высветліў карэспандэнт газеты «Звязда».

Наступленне халадоў — зусім не падстава адмаўляцца ад паходу па прадукты на сезонную частку рынку, лічаць заўсёднікі Камароўкі. Тым больш цяпер наступіла пара, калі варта актыўна запасацца вітамінамі.

Для гэтага ў першую чаргу зазіраем на прылаўкі з ягадамі. Па-ранейшаму на рынку можна знайсці клубніцы — у сярэднім па 20—25 рублёў за кілаграм. Прапануюць і шкляначкі маліны з абляпіхай. За 0,5 літра давядзецца аддаць 10 рублёў.

Карысныя журавіны і чарнаплодную рабіну можна купіць каля 7,5 рубля. Кіло першай у некаторых месцах ёсць і даражэй — па 9—10 рублёў. Танней абыдуцца брусніцы — у раёне 6-7 рублёў за кілаграм.



Аповед аб рынку будзе няпоўны без размовы з першай асобай прадпрыемства. Аб тым, як калектыў перажывае каранавірусны перыяд і аб планах на будучыню расказаў **генеральны дырэктар Мінскага Камароўскага рынку Мікалай ХМЯЛЬНІЦКІ.**

— Летась, калі пачалася пандэмія, прынялі пастанову аб штодзённай аплаце гандлёвага месца, каб ліквідаваць рызыкі для арандатараў. Час паказаў, што гэта было правільнае рашэнне, — кажа гендырэктар. — За гэты перыяд мы практычна не страцілі арандатараў. Магчыма, хтосьці стаў здымаць меншую колькасць гандлёвых месцаў, але касцяк людзей застаўся. Сумеснымі намаганнямі выстаялі.

Прадпрыемства працуе рэнтабельна і працягвае вызначаную раней мадэрнізацыю.

— Летась правялі рэканструкцыю трансфарматарнай падстанцыі, павялічылі яе магутнасці. Зараз завяршаецца будаўніцтва новага блока для збору бытавых адходаў. Там будзе аўтаматызаваная сістэма сартавання, — працягвае Мікалай Хмяльніцкі. — У наступным годзе плануем прыступіць да замены шклення крытага рынку, якое ўжо не адпавядае цяперашнім патрабаванням. Праект ёсць, ён ухвалены. Работа па замене будзе ісці па чарзе на працягу двух гадоў. Вядома ж, без закрыцця рынку.

Новыя вітражы вырашаць пытанне з вентыляцыяй крытага павільёна ў гарачы перыяд года. Гэта актуальнае пытанне, паколькі аб'ект пабудаваны ў 1980 годзе, калі тэхналогіі былі зусім іншыя і аб кандыцыяніраванні гаворка не вялася. Дарэчы, дырэктар падзяліўся такім фактам: канструкцыя купалу ўнікальная, яго трымаюць 38 тоўстых сталёвых тросаў. Штомесяц правярае іх на трываласць спецыялізаваная кампанія.

Нават халаднаватай лістападаўскай раніцай на галоўным харчовым рынку краіны можна сустрэць дзясяткі тых, хто жадае закупіцца свежай гароднінай

Па кавуны ў лістападзе чэргі не выстройваюцца, як яшчэ пару месяцаў таму, але набыць салодкі плод па-ранейшаму можна. Цана пытання — да 3 рублёў за кілаграм. Прадаўцы гарантуюць, што падбяруць максімальна сакавіты і смачны. У суседніх пунктах на прылаўках павабна ляжаць дыні. Цэннік на іх знаходзіцца на ўзроўні 5-6 рублёў.

Выбар садавіны цяпер нашмат большы, чым ягад. Асартымент адных толькі яблыкаў здзіўляе. Тут і «Ананаснае», і «Голдэн», і «Чэмпіён», і з дзясятак іншых — знойдуцца сарты і для пірагоў, варэння, і каб проста паласавацца. Большасць каштуе па 2 рублі за кілаграм.

Ёсць на прылаўках і грушы. Духмяная мядовая, напрыклад, выйдзе ў 2,5-3 рублі.

Мандарыны з кіслінкай на рынку ўдалося адшукаць па 4 рублі, лімоны з апельсінамі — па 5 рублёў. Вінаград розных гатункаў атрымаецца купіць ад 3 да 6 рублёў, гранаты і хурму — ад 3-4 рублёў. Экзотыку ў выглядзе фейхоа, якая нагадвае мікс ананаса, яблыка і мяты, прадаюць ад 5,5 рубля за кілаграм.

Як гарачыя піражкі на рынку разыходзіцца гародніна. Хатнія пупырчатыя агурочкі многія прадаўцы гатовыя прапанаваць па 3-5 рублёў, гладкія — на пару рублёў даражэй, таматы — каля 4 рублёў. Добра раскупляюць і баклажаны — іх рэалізоўваюць па 3,5 рубля.

Морква адправіцца да пакупніка за 1,5—2 рублі, трохі даражэй — буракі і перац. У дыяпазоне 2—2,5 рубля атрымаецца закупіцца цыбуляй і капустай. Кіло бульбы выходзіць у 1,8—2 рублі за кілаграм. Але самую дробную рэальна купіць удвая танней.

Зеляніну ў большасці гандлёвых пунктаў прадаюць па рублі. З больш дарагіх пучкоў — рукала, кінза па 2 рублі, брокалі — па 4 рублі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628), 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10 в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **13 декабря 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28

| № п/п | Предмет торгов | Цена предмета торгов с НДС, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72984, общ. пл. 207,0 кв. м, здание склада, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005436, общ. пл. 0,0471 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6А | 17 980,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72804, общ. пл. 413,0 кв. м, здание склада № 2, на зем. участке с кадастровым № 325050100002005434, общ. пл. 0,0976 га, г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Б | 35 748,00 |
| 3 | Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 533702 280 СМБ-249. 2006 г/в. Рег. знак АК8701-3, № рамы Y3BCMБ24961000437 / Y3M53370260007796, цвет – белый | 13 068,00 |
| 4 | Грузовой седельный тягач МАЗ 543302 220, 2007 г/в, рег. знак АВ 1970-3 | 2592,00 |
| 5 | Гидроманипулятор «Джонсэред» с комплектом для установки | 8316,00 |
| 6 | «Ленточнопильный станок МВ-2000м», производства ОДО «Технолессервис» г. Дзержинск, РБ, инв. бух. № 0007571 | 4968,00 |

**Местонахождение – г. Светлогорск, ул. Заводская, 10,**
**Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 27.11.2021 г. с 09.00 по 10.12.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 09.10.2021 г.



УНП 190398583

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении **21 декабря 2021 года в 11.00** аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках **322-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Предмет аукциона (наименование, место нахождения недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, срок договора аренды) | Площадь, кв.м | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) |
|---|---|---|---|
| 62 | Часть коридора, расположенная на 2-м цокольном этаже изолированного помещения, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Железнодорожная, 27/1. Срок аренды – 5 лет | 1,0 | 5,92 |

**Организатор аукциона –** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10

**Срок и место приема заявлений:** с 1 декабря 2021 г. по 15 декабря 2021 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). **Телефон для справок** +375 (17) 360 42 22.



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2021.Ч.002.00049** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский картонажно-полиграфический комбинат «Покровский», Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Покровская, 5, тел. +375 (212) 665361.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 28.12.2021 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49794 площадью 803,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, наименование – ангар-склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Кап. строение с инв. № 200/С-49795 площадью 49,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А/ 2, наименование – сторожевая, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: два навеса, шесть складов, проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота.

— Канешне, спрыяе. Па-першае, музей стварыў старэйшы сын Якуба Коласа Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч. Унучкі Якуба Коласа — Марыя Міхайлаўна і Вера Данілаўна, робяць шмат дзеля захавання і папулярызацыі жыцця і творчасці выдатнага класіка. Яны займаюцца даследчай дзейнасцю, прымаюць актыўны ўдзел у мерапрыемствах музея, робяць справу за цэлы навуковы аддзел, але на грамадскіх пачатках. Дзякуючы ім папаўняюцца фонды музея, узбагачаюцца новымі кнігамі пра Якуба Коласа і яго акружэнне бібліятэкі. І святы, прысвечаныя вялікаму класіку, з удзелам сям'і набываюць статуснасць і ўзрушальнасць. У самім музеі галоўным захавальнікам працуе Васіліна Міцкевіч, праўнучка Якуба Коласа: хто, як не сям'я, будзе з павагай і асцярожнасцю ставіцца да спадчыны свайго геніяльнага продка?

***— Праца музейшчыка непрадказальная... Ці даводзілася калі пераўвасабляцца ў літаратурнага героя або міфалагічнага персанажа? Калі не — ці ёсць такое жаданне?***

— Здаралася такое, падчас музейных свят «Ноч музеяў» была русалкай з верша Максіма Багдановіча, іспанкай, прынцэсай, прыходзілася для антуражу пераўвасабляцца, і мне гэта падабалася. І наведвальніку таксама цікава, калі з ім праводзяць інтэрактыў з элементамі акцёрскай гульні. Акцёрскае жаданне рэалізавала ў нейкай ступені, цяпер хачу быць рэальнай сабой.

***— Літаратурны музей — гэта і работа з архівамі, навуковы пошук... Якія цікавыя праекты на вашым рахунку?***

— Я прымала ўдзел у розных навуковых міжнародных канферэнцыях. Больш за ўсё любіла ствараць выстаўкі і шукаць для іх прадметы. Так адкрываеш для сябе новы свет унікальных музейных прадметаў. Найбольш значныя выставачныя праекты пад маім кураторствам: «Максімаў сад» — па творы Максіма Багдановіча «Мушка-зелянушка», «Я — Маці», прысвечаны юбілею маці Максіма Багдановіча, «Пад знакам Страціма» — апошні мой доўгатэрміновы выставачны праект у музеі Максіма Багдановіча да 130-годдзя з дня нараджэння паэта. У 2011-м да 120-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Смоліча, сябра Багдановіча, мною была створана маленькая выстаўка «Чалавек — крыніца сілы», інфармацыя пра яе трапіла ў інтэрнэт, і да нас звярнуўся ўнук Аркадзя Смоліча — Віталій Маос, які з Кіева прывёз архіў дзеда. Мая выстаўка мела цудоўны вынік — папаўненне фондаў і сяброўства музея з гэтай сям'ёй.

У 2012 годзе я прадстаўляла музеі Беларусі ва Ульянаўску на святочных мерапрыемствах да 200-годдзя з дня нараджэння Івана Ганчарова. І прывезла адтуль сувязі з іншымі музеямі Расіі. Так Літаратурны музей Максіма Багдановіча заключыў дагавор аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Дабралюбава. Музеі супрацоўнічаюць і па сёння.

***— Нядаўна прайшлі «Каласавіны», першыя з вашым удзелам у якасці дырэктара музея Якуба Коласа. Якія ўражанні?***

— На мой сорам, я наведала сядзібы Якуба Коласа ў Стаўбцоўшчыне ўпершыню. Упершыню была на такім свяце. Таму цікава было ўсё. Мясцовыя жыхары ўлюбёныя ў сваю малую радзіму, ганарацца земляком Якубам Коласам, гэта адчувальна і натхняльна. Пасля наведвання філіялаў уражанні мае розныя і як наведвальніка, і як музейнага калегі, і як дырэктара. Не хопіць месца распавесці, адзінае — буду вырашаць праблемы паступова.

***— Падзяліцеся ў якасці кіраўніка музея планамі: што цікавага адбудзецца, якія кірункі плануеце развіваць, якая аўдыторыя для вас прыярытэтная?***

— Наступны год юбілейны — 140 гадоў з дня нараджэння Якуба Коласа. Планаў шмат: унікальныя выстаўкі, музейныя святы, цікавыя сумесныя праекты з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы, з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча, з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з бібліятэкамі. Музей Якуба Коласа праводзіць мерапрыемствы для рознай аўдыторыі: экскурсіі, заняткі, інтэрактыўныя гульні. Мы будзем працягваць гэтую працу, ствараць новыя праграмы, магчыма, накіраваныя больш на сямейную аўдыторыю. Дом Коласа адкрыты для ўсіх.

***— І ў музеі Багдановіча, і ў музеі Коласа ёсць філіялы... Якое месца для вас было ўлюбёным у музеі Багдановіча і ў яго філіялах і чаму, а якое пакуль падаецца найбольш прыцягальным у музеі і філіялах Коласа?***

— Мне даспадобы музейныя фестывалі, якія праходзяць у філіялах: гэта не толькі праца, але і адпачынак на прыродзе, новыя знаёмствы з творчымі людзьмі, новыя адкрыцці. Коласаўскія мясціны шыкоўныя: прырода ўнікальная, дубы, ліпы такія велічэзныя — адзін не абдымеш. Гэта месца сілы для беларусаў, туды хочацца прыязджаць і адпачываць душою, адпачываць ад шумнага горада. У розную пару года яны па-свойму прыгожыя, і гэтым трэба прыцягваць наведвальніка. Можа, створым новы фестываль ці адновім былыя.

***— У вас незвычайная сям'я... Творчыя людзі, творчы асяродак. Як вы пазнаёміліся са сваім мужам, вядомым тэлежурналістам Аляксандрам Мацясам? Ці шмат падарожнічаеце разам, ці шмат абмяркоўваеце дома працоўныя моманты?***

— Нас аб'яднала культура. У музеі і пазнаёміліся. Аляксандр узяў інтэрв'ю, яму спадабаўся мой эмацыянальны аповед, гэта было на адкрыцці выстаўкі, прысвечанай 100-годдзю з дня выхаду адзінага зборніка вершаў Максіма Багдановіча «Вянок». Цяпер вандруем разам, сям'ёй, прывучаем да гэтага маленькую дачушку. Абавязкова ва ўсіх месцах, дзе бываем, наведваем музеі. Саша няспынны ў гэтым, мне хоць і цікава, але часам хочацца адпачыць ад інфармацыі. Сябры жартуюць, што мужчыны жонак у вандроўках водзяць на шопінг, а мой муж — у музей. Але я за гэта і ўдзячна свайму мужу, ён напаўняе мяне новымі ведамі, адкрыццямі, развівае. Мы з ім разам жывём сваёй працай, і размовы больш пра яе. Ён дае слушныя парады, дапамагае, падтрымлівае. Мы працуем там, дзе нам падабаецца, і, напэўна, гэта не праца, а вобраз жыцця.

***— Пералічыце, калі ласка, не задумваючыся, шэраг рэчаў, аб'ектаў, з'яў, якія для вас асацыіруюцца з музеем Багдановіча, а пасля — з музеем Коласа?***

— Музей Багдановіча: маладосць, зоркі, лёгкасць, каханне.

Музей Коласа: мудрасць, спакой, прырода, псіхалогія, разважлівасць.

Паводле гэтых адказаў, напэўна, я пасталела!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

# «СІМФОНІЯ» АДГУЧАЛА. ВОДГУЛЛЕ ЗАСТАЛОСЯ

## Акцэнты XXVII «Лістапада»

**Увесь тыдзень карэспандэнты газеты «Звязда» пільна адсочвалі падзеі, звязаныя з XXVII Мінскім міжнародным кінафестывалем «Лістапад». І калі імёны пераможцаў сталі вядомыя толькі ўчора ўвечары, аб найбольш яскравых момантах конкурсу можна распавесці ўжо зараз. Чым запомніцца «Лістапад»-2021 — чытайце ў нашым матэрыяле.**



sb.by

### Міжнародныя зносіны

Галоўны кінафестываль краіны — не толькі паказы фільмаў, але і сустрэчы з рэжысёрамі, прадзюсарамі і крытыкамі. У межах «Лістапада» адбылося шмат мерапрыемстваў і майстар-класаў, падчас якіх замежныя госці падзяліліся вопытам.

У кінатэатры «Цэнтральны» грузінскі рэжысёр Георгій Харэбава распавёў гісторыю стварэння стужкі «Роварам да месяца». Галоўны герой фільма — грузінскі спартсмен і рэкардсмен Джумбер Лежава, які здзейсніў кругасветнае падарожжа на ровары. Доўжылася гэтае падарожжа дзесяць гадоў без перапынкаў. Вядомы кібернетык і вынаходнік у 46 гадоў пераждаў клінічную смерць і выходжваў сябе сам, прыдумаўшы адмысловыя методыкі і вярнуўшыся ў спорт. А ў 54 гады пачаў падарожжа на ровары, маючы на мэце праехаць праз усе краіны свету:

— Я пачуў аб Джумберы ў 92-93-х гадах, калі быў студэнтам, — расказаў Харэбава. — Убачыўшы яго па тэлевізары, я зразумеў, што хачу з ім пазнаёміцца. Але доўгія гады нам не ўдавалася сустрэцца. Толькі на пачатку 2000-х мы з ім пасябравалі і пачалі прасоўваць праект, прысвечаны яму, на тэлебачанні. Спачатку мы думалі аб дакументальнай стужцы. Але Джумбер быў грандыёзным чалавекам, і мне здавалася, што распавесці яго гісторыю праз адзін фільм будзе немагчыма. Тады я задумаўся наконт тэлевізійнага серыяла. Гэты праект ухвалілі, але не атрымалася знайсці фінансаванне... Мы паўтарылі шлях Джумбера, у якога да канца падарожжа зусім не засталося грошай. Нацыянальны кінацэнтр нам таксама не дапамог, і мы дарабілі фільм самастойна. Матэрыял быў агромністы — 260 гадзін. Уявіце: чалавек пабываў ва ўсіх краінах свету, акрамя Паўночнай Карэі.

У якасці пляцоўкі для абмену вопытам выступіў і Музей гісторыі беларускага кіно — там прайшлі майстар-класы ад расійскіх і грузінскіх экспертаў кінаіндустрыі.

Першую лекцыю, прысвечаную пітчынгу дэбютных праектаў, прачытаў дырэктар Маладзёжнага цэнтра Саюза кінематаграфістаў Расіі Дзмітрый Якунін. На майстар-клас прыйшлі студэнты Акадэміі мастацтваў. Будучыя рэжысёры, аператары і сцэнарысты даведаліся, як прасунуць створаны фільм. А вось другая сустрэча, якую правяла прадстаўнік «Грузія фільм» Хатуна Хундадзэ, пазнаёміла навучэнцаў мінскай гімназіі з класікай грузінскай анімацыі.

— Мяркую, што анімацыя і музыка не патрабуюць перакладу. Калі вы ўмееце маляваць — малюйце, ствараце сваіх герояў. І ў пэўны час гэтыя персанажы абавязкова ажывуць, — адзначыла Хатуна напрыканцы сустрэчы.

### «QAZAQ. Гісторыя аднаго чалавека». Гучная прэм'ера

Адной з галоўных падзей сёлетняга «Лістапада» стала прэм'ера фільма «QAZAQ. Гісторыя аднаго чалавека». Дакументальная стужка прысвечана жыццю і палітычнай кар'еры першага прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева. Карціну прадставілі ў кінатэатры «Масква». Наступныя паказы запланаваны ў Берліне, Пекіне, Абу-Дабі і Стамбуле.

На пытанне журналістаў чым «QAZAQ. Гісторыя аднаго чалавека» адрозніваецца ад папярэдніх фільмаў, рэжысёр Ігар Лапацёнак адказаў так:

— Калі ты пачынаеш працаваць над фільмам, ніколі не ведаеш, якім ён атрымаецца ў выніку. І справа тут не ў бюджэце, кастынгу або тэме. Кіно — гэта магія. Яно можа скласціся, а можа і не скласціся. Гэтая стужка ўдалася. Ад папярэдніх работ яна адрозніваецца тым, што нам удалося знайсці нейкі трэнд, які ўсё аб'яднаў, — тое, што адбываецца на тэрыторыі былых краін СССР. Зараз час збіраць тыя супольнасці, якія раней былі раз'яднаныя...

Шмат пытанняў гучала наконт асобы Назарбаева. Асабліва цікавіліся тым, наколькі гэта закрыты чалавек.

— Гэта максімальна адкрытая асоба, — распавёў Лапацёнак. — Ведаеце, усё вельмі залежыць ад таго, хто задае пытанні. Я не быў знаёмы з ім раней, але ў мяне ўжо ёсць вопыт узаемадзеяння з палітычнымі дзеячамі. Мы заўсёды імкнёмся запісаць першую сустрэчу, гаворку. Таму што першыя ўражанні найбольш яскравыя. Мы пазбягалі «жоўтых» тэм, гэта нам нецікава.

Аб планах кінапраекта расказаў прадзюсар Ігар Кобзеў:

— Ганаруся тым, што прымаў удзел у гэтым праекце. Гэта трэці кінафестывальны паказ стужкі: мы ўжо з'ездзілі ў Рым і Лос-Анджэлес. Таксама ёсць 8-серыйны фільм, які мы плануем трансліраваць у якасці тэлесерыяла. Спадзяюся, у нас будзе не толькі кіна-, але і тэатральны пракат. Жанр «QAZAQ. Гісторыя аднаго чалавека» ў большай ступені нагадвае драму, чым дакументальны фільм.

З цікавых фактаў можна адзначыць тое, што музычнай афарбоўкай фільма займаўся італьянскі кампазітар і дырыжор Карла Сіліёта. Трэкі былі запісаны ў адной з зал «Астана-оперы», што знаходзіцца ў Нур-Султане. Удзельнікі сустрэчы засяродзілі ўвагу на тым, што «QAZAQ. Гісторыя аднаго чалавека» ўжо ўключыўся ў гонку за прэмію «Оскар» і нават атрымаў першую музычную намінацыю:

— Хачу дадаць, што мы не строім ілюзій наконт статуэтак, — адзначыў Ігар Лапацёнак. — Мы робім нашы фільмы не дзеля ўзнагарод. І асноўную адзнаку нам дае не акадэмічная кінасупольнасць, а ўсё ж такі глядач.

Нагадаем, што ў межах «Лістападу» фільм удзельнічаў у пазаконкурснай праграме.

### Вынікі «Лістападзіка»

Абвяшчэнне фільмаў-пераможцаў XXVII «Лістапада» адбылося ўчора ўвечары, а пераможцы дзіцяча-юнацкай секцыі ўжо абвешчаны. Усяго ў «Лістападзіку» ўдзельнічала 14 стужак. Найбольшую колькасць прызоў атрымаў расійскі фільм Аляксандра Куляміна «Новенькі». Работа перамагла ў наступных намінацыях: «Прыз глядацкіх сімпатый», «Найлепшая дзіцячая роля» — яе выканала Вераніка Усцінава, найлепшай работай акцёра ў дзіцячым фільме быў адзначаны Архіп Лебедзеў. Акрамя гэтага, «Новенькаму» прысудзілі прыз Савета юных кінакрытыкаў.

Наступная работа, якая не засталася без увагі сяброў журы, мае назву «Нават мышы трапляюць у рай» рэжысёраў Яна Бубенічыка і Дэніза Грымава. Над анімацыйным фільмам працавалі адразу некалькі краін: Чэхія, Францыя, Славакія і Польшча. Стужка атрымала «Залаты Лістападзік» за найлепшы фільм.

Падчас падвядзення вынікаў «Лістападзіка» былі адзначаны і работы беларускіх аніматараў. «Прэлюдыя і фуга» Ігара Волчака атрымала спецыяльны прыз журы «За сімфонію пачуццяў». Стужка адлюстроўвае дзіцячыя ўспаміны аб Таджыкістане. Мультфільм, прысвечаны Максіму Багдановічу, стварыла Алена Пяткевіч — «Я тайну ў глыбіні душы хаваю». Работа была ўзнагароджана дыпломам «За акварэльную паліфанію душы паэта».

### Творчасць беларусаў у межах конкурсу

Так, фестываль скончыў сваю працу, але магчымасць пазнаёміцца з дзейнасцю айчынных рэжысёраў у нас яшчэ будзе.

Напрыклад Музей гісторыі беларускага кіно прапануе цікавы праект. Выстаўка «Віктар Тураў. Подых жыцця» прысвечана 85-годдзю з дня нараджэння беларускага кінарэжысёра. Наведвальнікі ўбачаць эскізы дэкарацый і касцюмы, зробленыя мастакамі-пастаноўшчыкамі, а таксама кінаплакаты, фотаздымкі і тэматычную інсталяцыю. Азнаёміцца з экспазіцыяй можна будзе да 31 снежня.

Таксама падчас правядзення «Лістапада» адбылася прэм'ера дакументальнага фільма «Страла» Галіны Адамовіч. Стужка распавядае аб невялікай вёсцы на гомельскім Палессі і яе жыхарах, якія захоўваюць старажытныя традыцыі. Спадзяюся, што ў нас яшчэ будзе магчымасць паглядзець гэтую выдатную работу на вялікіх экранах.

У наступным нумары «Звязды» з'явяцца імёны пераможцаў «Лістапада» 2021 года.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# КАНЦЭПЦЫІ «КАНЦЭПТУ»

## Распачаў работу фестываль сучаснага мастацтва

**Праект канцэптуальнага мастацтва — трыенале «Канцэпт» распачаў работу ўжо 18 лістапада, а асноўнай пляцоўкай стаў Палац мастацтваў. Першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ адзначыла:**


nlb.by

— Хацелася паказаць, што ў Мінску ёсць шмат творцаў, якія разважаюць на зусім іншай мове, валодаюць нечаканай пластыкай і эксперыментуюць. Мы запрашалі да ўдзелу не толькі сяброў Саюза мастакоў, але і ўсіх, хто скончыў навучанне, але не ўвайшоў у саюз, студэнтаў... Важна было паказаць, што мастацкі эксперымент жыве не толькі на прасторах Мінска. Па сутнасці, мы аб'ядналі мастацтва ўсёй нашай краіны.

У сваю чаргу Андрэй Духоўнікаў, дырэктар Віцебскага цэнтра сучасных мастацтваў, дадаў, што пакуль у Беларусі няма канцэптуальнай традыцыі. Але фестывалі накшталт «Канцэпт» дапамагаюць стварыць глебу для моладзі, якая хоча працаваць у гэтым напрамку.

Адметна і тое, што праекты мастакоў будуць суправаджацца тэкставымі выказваннямі. Як адзначыла Наталля Шарангові, сучаснае канцэптуальнае мастацтва — гэта не толькі мастацкі аб'ект, але і ўласная, вербальна аформленая думка аўтара. Менавіта таму падчас збору заявак да ўдзелу ў фестывалі арганізатары прасілі даслаць і тэкставую канцэпцыю праекта.

«Канцэпт» будзе доўжыцца і ў снежні. Так, 8 снежня адкрыецца выстаўка эксперыментальнага тэкстылю. Гэты праект аб'яднаў мастакоў, якія працуюць з матэрыяламі не ў традыцыйных напрамках. У якасці прыкладу **Вольга РАДНІКІНА, старшыня секцыі тэкстылю Беларускага саюза мастакоў,** прывяла лічбавы тэкстыльны відэаарт:

— Гэта не дыванок на сцяне, як мы ўсе прызвычаіліся думаць. У апошнія гады мастакі пачалі выкарыстоўваць нетыповыя матэрыялы: метал, шкло, пластык, смалу. Прастора галерэі «Высокае месца» дазволіць нам паказаць розныя напрамкі ў працы з тэкстылем. Адна з залаў будзе цёмнай — там мы плануем прадставіць тэкстыль са святла.

Чарговай пляцоўкай фестывалю сталі галерэі Нацыянальнай бібліятэкі. Там можна пазнаёміцца з работамі мастакоў-авангардыстаў, якія сфарміравалі пластычную мову ў канцы 80-х і на пачатку 90-х гадоў. Выстаўка адкрылася 25 лістапада.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Выигрывай с Onliner 19»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 19» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети интернет-сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу: https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**1. Организатор и Заинтересованное лицо Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – 613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

1.2. Заинтересованное лицо Рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «ГиперАйТиТрэйд», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190791139, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 12.01.2007.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Выигрывай с Onliner 19».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры**

4.1. Рекламная игра проводится с 01.12.2021 по 31.01.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования написания отзывов на интернет-ресурсе https://www.onliner.by о реализуемых интернет-магазинами товарах, рекламируемых в разделе сайта https://catalog.onliner.by.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Жуковец Илья Николаевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора по развитию;
- Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;
- Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;
- Сахаров Сергей Леонидович, ООО "ГиперАйТиТрэйд», ведущий специалист по маркетингу.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

7.4. Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения требований, закрепленных в пп. 8.1.–8.3. настоящих Правил.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. зарегистрировать на интернет-ресурсе https://www.onliner.by учетную запись (профиль) на заявленных администрацией сайта условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора – https://www.onliner.by. При этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью до 26.12.2021 (включительно);

8.1.3. в период с 01.12.2021 по 26.12.2021 (включительно) оставить отзыв о любом товаре, размещенном в разделе сайта https://catalog.onliner.by. Исключение составляют товары со статусом «Товар снят с продажи».

8.2. Отзыв должен относиться к приобретенному товару; представлять собой рассказ объемом не менее 10 (десяти) слов о потребительских свойствах и особенностях товара, личных впечатлениях от его использования; быть написан русским/белорусским литературным языком согласованными предложениями; соответствовать требованиям морали, не содержать ненормативной лексики, жаргона, оскорблений и т. п.; содержание отзыва не должно повторять содержание ранее опубликованных отзывов на сайте Организатора либо на иных сторонних интернет-ресурсах.

Организатор не несет ответственности за достоверность содержащихся в отзыве сведений. Комментарий о товаре является сугубо субъективным мнением автора отзыва.

8.3. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые выполнили приведенные в п. 8.1.–8.2. условия, отзывы которых прошли успешную модерацию (проверку) со стороны Организатора и были опубликованы на сайте https://www.onliner.by в период с 01.12.2021 по 27.12.2021 (включительно). Пользователи, отзывы которых были отклонены Организатором по причине их несоответствия настоящим Правилам, к участию в Рекламной игре не допускаются.

8.4. При оставлении отзыва пользователь в течение 30 минут после его написания получит на адрес электронной почты, указанный при регистрации на сайте https://www.onliner.by, письмо, в котором будет содержаться информация об уникальном номере, присвоенном отзыву. Уникальный номер присваивается автоматически и соответствует дате и времени оставления пользователем отзыва на сайте Организатора. После проверки комментария на предмет его соответствия настоящим Правилам Организатор уведомит автора об опубликовании либо отклонении (удалении) отзыва посредством сообщения, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на сайте https://www.onliner.by в срок до 27.12.2021 (включительно).

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора, а также имущества Заинтересованного лица в размере **4243,11** (четыре тысячи двести сорок три) белорусских рубля **11** (одиннадцать) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз | Мобильный телефон (смартфон) XIAOMI 11T | 3 | 1250,00 | 3750,00 | без НДС | – | 3750,00 |
| | денежные средства в размере | | 164,37 | 493,11 | – | – | 493,11 |
| **Итого:** | | | | | | | **4243,11** |

**10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призового фонда проводится 30.12.2021 в 12.15 в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, ООО «Онлайнер».

10.2 Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей Рекламной игры**

11.1. До момента проведения розыгрыша призов Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется в порядке возрастания по дате и времени оставления Участниками отзывов о товарах. Каждому такому отзыву в Списке присваивается свой итоговый порядковый номер, который является участвующим в розыгрыше Игровым кодом. Нумерация Игровых кодов начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код Участника; уникальный номер отзыва; дату и время оставления отзыва; дату и время опубликования отзыва; дату и время, когда пользователь подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрыша используются лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет очередную цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим «Приз» в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно пп. 11.3.–11.5. настоящих Правил, и каждый 1000-й (тысячный), следующий за ним в Списке, в количестве 2 (двух) Игровых кодов. Всего разыгрывается 3 (три) приза.

В случае если выигрышный Игровой код Участника попадает на конец Списка, дальнейшее исчисление Игровых кодов продолжается с начала Списка.

11.7. Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор до 07.01.2022 (включительно) уведомляет победителей письмом, высланным по адресу электронной почты, указанному Участником при регистрации профиля на сайте https://www.onliner.by. Организатор также вправе дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза победители должны явиться не позднее 31.01.2022 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона + 375 29 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 29.01.2022 с 10.00 до 13.00. При получении приза победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1. способами; неявки победителя за получением приза в определенный в п. 13.1. срок; указания победителем недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; непредоставления победителем Организатору сведений и документа, необходимых для получения приза; письменного отказа победителя от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, – победитель лишается права на получение приза. В такой ситуации приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении победителю имущества «Приз» обязан удержать у последнего причитающиеся ему денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя указанного приза в размере **164** (сто шестьдесят четыре) белорусских рубля **37** (тридцать семь) копеек.

13.5. Расходы, связанные с проездом победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 18.01.2022 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона: + 375 29 514-35-24. Звонок платный в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в любых рекламных и/или иных информационных материалах, связанных с Рекламной игрой, права на которые принадлежат Организатору.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче Приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за полноту и достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу организаций, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовых электронных сервисов (сроки доставки электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, а также посредством электронной почты: game19@onliner.by.

*Свидетельство № 4108 о государственной регистрации рекламной игры выдано 18 ноября 2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*


Могилевский филиал

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**информирует о проведении 09.12.2021 г. открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»**

**Лот № 1:** **Капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – Котельная**, пл. – 687,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – Мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – Склад**, пл. – 44,2 кв. м. **Емкость металлическая 80 м³**, инв. № 5283; **Участок наружной канализации протяжением 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642).

Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота не выделен.

***Начальная цена продажи: 111 072,00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 11 107,20 бел. руб.***

**Аукцион состоится 09 декабря 2021 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**



**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»** (УНП 700003471), объявляет о проведении 29.12.2021 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

| Наименование лота | Минимальная цена, бел. руб., без НДС |
|---|---|
| Лот 1. Комплекс имущества № 2 Бобруйское ОАО «Агромашсервис» | 157 218,00 |
| Лот 2. Котельная | 8 520,00 |
| Лот 3. Здание металлического гаража | 12 360,00 |

Ознакомиться с перечнем имущества, входящим в состав комплекса, можно по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/11/spisok-imushhestva-bobrujskoe-oao-agromashservis_torgi_29_12_21.pdf

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»**.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 28.12.2021 г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 29.11.21 по 17.00 28.12.21 на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор по лоту № 1 – 2 %, по лотам №№ 2, 3 – 5 % от цены реализации предмета торгов; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб.; 320,00 бел. руб. за оценку по каждому объекту недвижимости.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение десяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель (претендент) обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в сроки, установленные договором купли-продажи.

# ЦМОК І ЦЮЦЬКА

## Чаму Літва раззлавала Кітай?

**Кітай панізіў дыпламатычныя адносіны з Літвой да ўзроўню паверанага ў справах. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на МЗС КНР. У заяве ведамства ўдакладняецца, што, нягледзячы на рашучыя пратэсты з боку Кітая, Літва ўхваліла стварэнне так званага «прадстаўніцтва Тайваня ў Літве». «Кітай у сувязі з гэтым выказвае рэзкую незадаволенасць», — дадалі ў МЗС. Адносіны Літвы і Кітая абвастрыліся сёлета ў жніўні, калі літоўскія ўлады далі афіцыйную згоду на адкрыццё прадстаўніцтва Тайваня. Пекін пайшоў на рашучыя меры: адклікаў свайго пасла і звярнуўся да літоўскага боку з просьбай адклікаць свайго прадстаўніка з КНР, што Вільнюс і зрабіў у пачатку верасня. Чаму Літва раззлавала Кітай, чаго чакаць надалей?**

### НЕ ТЫМ ШЛЯХАМ

Некалькі гадоў таму Літва імкнулася сябраваць з Кітаем. Вільнюс цікавіўся транснацыянальным праектам «Адзін пояс — адзін шлях», які ініцыіраваў старшыня КНР Сі Цзіньпін. Глабальная ініцыятыва ў тым ліку планує стварэнне транспартнай інфраструктуры для перамяшчэння тавараў паміж Паднябеснай і Заходняй Еўропай. Літва разлічвала атрымаць кітайскія інвестыцыі і загрузіць свае парты на Балтыцы. У лістападзе 2018 года тагачасны прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ наведала Паднябесную. Падчас візіту кіраўнік дзяржавы называла Кітай важнай для Вільнюса краінай, рэкламавала літоўскія прадукты харчавання, а ў Шанхаі асабіста сустрэлася са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, нагадаў iz.ru.

Аднак неўзабаве сітуацыя кардынальна змянілася. Паміж ЗША і Кітаем разгарнулася гандлёвая вайна, і амерыканскі Дзярждэп рэкамендаваў сваім саюзнікам і сатэлітам адмовіцца ад узаемадзеяння з Пекінам. У 2019 годзе дэпартамент дзяржбяспекі (ДДБ) Літвы ўпершыню ў сваёй справаздачы назваў Кітай пагрозай. Сцвярджалася, што КНР запаўняе рэспубліку шпіёнамі, вярбуе чыноўнікаў, імкнецца атрымаць доступ да засакрэчанай інфармацыі. У сваю чаргу, прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа папярэджваў, што магчымыя інвестыцыі Кітая ў будаўніцтва глыбакаводнага порта ў Клайпедзе могуць... нашкодзіць нацыянальнай бяспецы краіны.

**Эксперты справядліва ўказваюць на тое, што ў Літве ўжо цяпер ледзь не ўсё закручана вакол «Зроблена ў Кітаі», а Пекін можа знайсці спосабы паўплываць не толькі на прамыя гандлёвыя плыні паміж краінамі, але і задушыць літоўскую эканоміку акруговымі шляхамі.**

Характэрнай для новага тыпу адносін стала кампанія супраць карпарацыі Huawei. Тая збіралася ўстанавіць у Літве сістэму мабільнай сувязі пятага пакалення (5G). Але літоўскія палітыкі абвінавацілі Huawei ў сачэнні і шпіянажы. «Ёсць пэўная інфармацыя аб тым, што там існуюць так званыя backdoors, праз якія можна выцягваць даныя з камер, тэлефонаў ці той жа сістэмы 5G», — казаў кіраўнік ДДБ Дарус Яўнішкіс. Пазней рэспубліка афіцыйна адмовілася ад кітайскага абсталявання. Пры гэтым кіраўнік тэлекамунікацыйнай кампаніі Telia Lietuva Дон Стромберг прызнаў, што надзвычай перспектыўнае і выгаднае супрацоўніцтва разарвалі па геапалітычных прычынах.

У 2020 годзе дэпартамент дзяржбяспекі Літвы выпусціў новую справаздачу, у якой абвінаваціў Пекін у імкненні да тэхналагічнай перавагі. Цікава, што дакумент з'явіўся ў разгар пандэміі каранавіруса. Неўзабаве пасля гэтага Кітай адправіў прыбалтыйскай рэспубліцы гуманітарную дапамогу — 20 тысяч масак і 120 тысяч пальчатак. Прыгожы жэст у Вільнюсе, зрэшты, не ацанілі. Восенню мінулага года ў краіне прайшлі парламенцкія выбары, на якіх перамогу атрымалі кансерватары з партыі «Саюз Айчыны — Хрысціянскія дэмакраты». Адразу пасля абвяшчэння вынікаў галасавання ў аб'яднанні паабяцалі абараняць дэмакратыю па ўсім свеце — «ад Беларусі да Тайваня».

### У КУТ ЗА ПАВОДЗІНЫ

Нядзіўна, што сёлета канфлікты працягнуліся. У лютым Вільнюс адмовіўся купляць сканеры для нагляду багажу ў аэрапортах ад кітайскай кампаніі Nuctech. Тая прапанавала самыя выгадныя ўмовы і выйграла тэндар, але ўрадавая камісія заблакіравала здзелку. «Літва вырашыла не быць часткай тэхнасферы, якая ствараецца і кантралюецца Кітаем», — заявіў кіраўнік парламенцкага камітэта нацыянальнай бяспекі і абароны Лаўрынас Кашчунас.

Увесну гэтага года літоўскія парламентарыі ўзнялі уйгурскае пытанне. Вільнюс сам адчайна напрошваўся і нават правакаваў абвастрэнне. У маі Літва гучна выйшла з кітайскага блока 17+1. Гэты фармат зарадзіўся ў 2012 годзе як пляцоўка для супрацоўніцтва Кітая з краінамі Усходняй Еўропы для рэалізацыі праекта «Новага шаўковага шляху». І не проста выйшла, а заклікала іншыя краіны ЕС рушыць услед гэтаму яе прыкладу. «Такой рэчы, як «17+1», больш не існуе, паколькі там адсутнічае Літва», — цытавала ў канцы мая выданне Politico словы відавочна задаволенага сабой кіраўніка МЗС Літвы Габрыэлюса Ландсбергіса.

Гісторыя з адкрыццём прадстаўніцтва Тайваня стала чарговай чырвонай рысай, якую перайшла Літва ў адносінах з Кітаем. Эксперты лічаць, што Паднябесная відавочна не пакіне без увагі дэмарш Літвы. «Вільнюс доўгія гады спрабаваў сфарміраваць максімальна антыкітайскую пазіцыю сярод усіх членаў ЕС па ўйгурскім, тыбецкім і іншых пытаннях. Мабыць, Літва мае на мэце стаць у вачах Вашынгтона ўмоўным цэнтрам супрацьўлення Расіі і Кітаю ва Усходняй Еўропе», — заўважыў spbvedomosti.ru кітаязнаўца Мікалай Вавілаў.

Як лічыць намеснік дырэктара Інстытута Далёкага Усходу РАН Андрэй Астроўскі, «было б нядрэнна аб наступствах падумаць». «Рэакцыя Кітая прадказальная, — заўважыў ён. — КНР заўсёды вельмі цвёрда рэагуе на любыя дзеянні, якія ствараюць пагрозу тэрытарыяльнай цэласнасці краіны. А рашэнне адкрыць прадстаўніцтва Тайваня з'яўляецца менавіта такім крокам». Па словах эксперта, у літоўскім МЗС павінны былі гэта разумець і пралічыць наступствы. Тым больш што іх суседзі-латышы ўжо зрабілі такое глупства: у 1992 годзе адкрылі ў сябе прадстаўніцтва Тайваня. Кітай адрэагаваў гэтак жа імкліва і жорстка, як і зараз. «Характэрна, што тады праз два гады тайваньскае прадстаўніцтва латышы закрылі, прычым з прабачэннямі перад Кітаем. І падстаў меркаваць, што рэакцыя Пекіна на дзеянні Вільнюса сёння будзе іншая, няма», — заўважыў аналітык.

Эксперты сцвярджаюць, што Літва стала адным з ініцыятараў абвастрэння адносін ЕС з КНР. «Вільнюс імкнецца цесна ўзаемадзейнічаць з Вашынгтонам, выступае ў ролі правадніка амерыканскай палітыкі ў рэгіёне. Зразумела, што Пекін зможа абысціся без прыбалтыйскай рэспублікі, эканамічна Літва зацікаўлена ў супрацоўніцтве значна больш», — адназначыў iz.ru Мікалай Вавілаў.



Пры гэтым, як лічыць прафесар МДІМА Кірыл Коктыш, у цяперашнім канфлікце Літвы і КНР Вільнюсу не варта разлічваць на дапамогу Бруселя. «Прыбалтыйскія краіны занадта ўжо трапятліва прыслухоўваюцца да Вашынгтона, Літва не з'яўляецца выключэннем і нават па сваёй «чуласці» ідзе на першым месцы. Усе яны ва ўсім арыентуюцца на ЗША, і гэта насцярожвае Еўрасаюз. Любыя цяжкасці, якія ў іх узнікаюць, насамрэч на руку Бруселю, таму што гэта можа падарваць уплыў па-праамерыканску настроеных палітычных эліт і прывядзе да ўзмацнення ўплыву Бруселя на ўсходнееўрапейскіх членаў ЕС. Таму яны, канешне, могуць дапамагчы, а могуць і не дапамагаць. Атрымліваецца, што сваімі паводзінамі Літва сама загнала сябе ў кут», — заключае аналітык.

Галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН Мікалай Мяжэвіч кажа, што рацыянальнаму тлумачэнню літоўская знешняя палітыка не паддаецца. «ВУП рэспублікі ў разы меншы за ВУП аднаго Шанхая. Паводзіны Літвы не ўпісваюць у тэорыю міжнародных адносін. Але трэба разумець, што літоўскія ўлады дзейнічаюць не ў сваіх інтарэсах, а ў інтарэсах ЗША. Калі памятаць пра гэта, то ўсё ўстае на свае месцы», — падкрэсліў эксперт.

### ШМАТ РЫЧАГОЎ

Яшчэ ў жніўні, калі пачала разгортвацца гісторыя з адкрыццём прадстаўніцтва Тайваня, кітайская China Railway Container Transport Corp. праінфармавала кліентаў у Літве аб тым, што прамыя грузавыя цягнікі з Паднябеснай у балтыйскую рэспубліку адмяняюцца. Гэта зрабілі «ў сувязі з напружанай палітычнай сітуацыяй паміж краінамі». Прэзідэнт Літоўскай канфедэрацыі прамыслоўцаў Відмантас Янулявічус заўважыў літоўскаму парталу 15min, што гэта балючае рашэнне, бо літоўскі бізнес перажывае адразу некалькі ўдараў, у тым ліку санкцыі супраць Беларусі і пошук новых пастаўшчыкоў сыравіны.

Таксама высветлілася, што спыняюцца не толькі кітайскія цягнікі ў Літву — экспарцёры краіны скардзяцца, што Кітаю аказалася больш не патрэбная літоўская прадукцыя — мэбля, малочная прадукцыя, збожжа... Дырэктар мэблевага прадпрыемства Medvita Арунас Залецкіс распавёў парталу Delfi, што 99 працэнтаў продажаў кампаніі — у Кітай. Зараз продажы застапарыліся, і прадпрымальнік плануе ўвогуле вывесці свой бізнес з Літвы: «Кітайцы нідзе не хочуць бачыць літоўскую кампанію».

Не хавае свайго расчаравання і кіраўнік аднаго з найбуйнейшых у краіне прадпрыемстваў па перапрацоўцы малака «Vilkyskiu pienine» Гінтарас Берташус: раней урад Літвы заахвочваў паездкі ў Кітай, арганізоўваў бізнес-місіі, а зараз усё наадварот. Кіраўнік кампаніі сцвярджае, што продажы на гэтым рынку спыніліся, вытворчасць падае. Нават літоўскія збожжавыя больш не ходзяць па «Шаўковым шляху». «Нашы партнёры ў Кітаі проста шукаюць прычыны для разрыву гандлёвых адносін», — прызнае прэзідэнт Літоўскай асацыяцыі перапрацоўшчыкаў і гандляроў збожжам і кіраўнік кампаніі Agrokoncerno grudai Караліс Шымас.

Эксперты справядліва ўказваюць на тое, што ў Літве ўжо цяпер ледзь не ўсё закручана вакол «Зроблена ў Кітаі», а Пекін можа знайсці спосабы паўплываць не толькі на прамыя гандлёвыя плыні паміж краінамі, але і задушыць літоўскую эканоміку акруговымі шляхамі. «Кітай — вялізная краіна. Праз некалькі гадоў па намінальным унутраным валавым прадукце ён можа стаць найбуйнейшай эканомікай свету. Па парытэце пакупніцкай здольнасці ён ужо з'яўляецца сусветным лідарам. У яго шмат рычагоў уплыву на розныя краіны, у тым ліку і на ЕС, з якім у Пекіна вельмі моцныя гандлёвыя сувязі», — сказаў тэлеканалу Lietuvos rytas літоўскі палітолаг Лінас Каяла.

### КАМАР У КАТЛЕ

Літва — вельмі маленькая і слабая краіна, навошта яна ўтварае хаос, здзіўляецца адна з найбуйнейшых і ўплывовых у КНР газета «Хуаньцю шыбаа» (выданне спецыялізуецца на асвятленні міжнародных падзей, агульны тыраж — каля 2 мільёнаў асобнікаў. Партал «Хуаньцюван» — адзін з самых наведвальных у Паднябеснай: штодзённая аўдыторыя дасягае больш за 100 мільёнаў чалавек) у сваім рэдакцыйным артыкуле, нагадваючы, што Пекін абвясціў аб паніжэнні дыпламатычных адносін з Вільнюсам.

«Выкладаючы прычыны дыпламатычнага паніжэння, Кітай выкарыстоўваў вельмі стандартныя фармулёўкі», — адзначае выданне. Пры гэтым яно папярэджвае, што дзяржаўныя паводзіны і дыпламатычная мова КНР сведчаць аб тым, што ён проста «трымае сябе ў рамках дазволенага». «Навошта Літве пераходзіць дарогу Кітаю? Насельніцтва гэтай краіны меншае за колькасць людзей, якія пражываюць у раёне Чааян Пекіна. Літва — гэта нават не моська, якая брэша на слана (ці звяглівая і надакучлівая цюцька насуперак дракона. — **Рэд.**), яна — не больш чым блыха», — абураецца «Хуаньцю шыбаа».

Як падкрэслівае газета, «нават калі Кітай разарве дыпламатычныя адносіны з такой маленькай несумленнай краінай, дазволіўшы ёй устанавіць дыпламатычныя адносіны з Тайванем, гэта будзе не больш чым дабаўленне яшчэ аднаго камара ў кацёл кітайскай дыпламатыі». У артыкуле «Хуаньцю шыбаа» таксама звяртаецца ўвага на тое, што «парламенты Злучаных Штатаў і заходніх краін пачалі дастаўляць усё больш праблем Пекіну, «з'явіліся такія ашуканцы, як Літва, якія патрабуюць кампенсацыю за нанесеную імі ж шкоду».

«Рашэнне праблемы наконт таго, як справіцца з недастатковай стратэгічнай мудрасцю Літвы, цалкам знаходзіцца ў руках Пекіна», — рэзюмуе выданне. EADaily дадае, што чытачы «Хуаньцю шыбаа» прапанавалі падзяліць Літву паміж Расіяй і Беларуссю, адрэагаваўшы такім чынам на дыпламатычныя супярэчнасці паміж афіцыйнымі Пекінам і Вільняй.

Нагадаем, што раней у лістападзе старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас анлайн-сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам перасцярог Штаты ад гульняў з незалежнасцю Тайваня. Байдэн паабяцаў не падтрымліваць незалежнасць Тайваня і не стварацъ саюзаў супраць Кітая.

Тым часам кіруючая кааліцыя Германіі заявіла, што выступае за дыялог з Кітаем. Пра гэта гаворыцца ў тэксце кааліцыйнага пагаднення, якое заключылі сацыял-дэмакраты, лібералы і «зялёныя» — партыі, якія прадстаўляюць наступны ўрад ФРГ. «Мы імкнёмся да супрацоўніцтва з Кітаем усюды, дзе гэта магчыма», — адзначаецца ў пагадненні.

На гэтым фоне дзеянні літоўскіх улад выглядаюць проста вар'яцтвам. Што дазваляе, напрыклад, лідару парламенцкай апазіцыі Рамунасу Карбаўскісу сцвярджаць: «У нас самы безнадзейны ўрад у гісторыі Літвы. Імпатэнты цягнуць краіну ў прорву». Не паспрачаешся.

**Пётр ДУНЬКО.**

алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



Уладзімір СІВІЦКІ:

# «КАЛІ ЧАЛАВЕК АБМЕЖАВАНЫ Ў НЕЧЫМ АДНЫМ, ТО НЕ АБМЕЖАВАНЫ Ў ІНШЫМ»

**Сусветны спорт даўно выйшаў за межы стадыёнаў. Сёння гэта не проста спаборніцтвы, медалі і рэкорды, але і вялікі сацыяльны праект. Гендарная роўнасць, праблемы экалогіі, барацьба з пандэміяй — пералічваць пытанні, якія дапамагае вырашаць спорт, аб'ядноўваючы мільёны людзей, можна бясконца. Упэўнена вырашаецца з дапамогай спорту і вельмі важная праблема — рэабілітацыя і сацыялізацыя людзей з інваліднасцю. Параалімпійскі спорт актуалізуе мноства аспектаў: ад безбар'ернага асяроддзя да стаўлення грамадства да інвалідаў. Гэта вельмі важны паказчык развіцця краіны. Для Беларусі адкрываецца вялізны фронт работы, нягледзячы на тое, што яна ўжо вядзецца. У краіне мала спартыўных секцый для дзяцей-інвалідаў, не хапае трэнераў, не ва ўсіх месцах ёсць якаснае безбар'ернае асяроддзе. А ў цэнтры самае галоўнае пытанне — адносіны грамадства да інвалідаў. Чамусьці многія дагэтуль лічаць іх непаўнацэннымі. Спорт такі падыход рашуча абвяргае. І ў гэтым галоўнае дасягненне параалімпійскага спорту. Важна кожнаму ўсвядоміць, што людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі маюць бязмежную сілу духу і ў іх ёсць чаму павучыцца. Парады, як прайсці гэты шлях, даў загадчык кафедры псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Уладзімір СІВІЦКІ.**



***— Уладзімір Генадзьевіч, з пункту погляду псіхалогіі, наколькі спорт — карысны і паспяховы спосаб сацыялізацыі і рэабілітацыі людзей з інваліднасцю?***

— Адказваючы на гэта пытанне, варта вярнуцца да паняцця «спорт». Сёння спорт — шматфактарная сацыяльная з'ява, у якой можна знайсці і вědвішча, і прафесію, і дасягненні, і самарэалізацыю, і спосаб развіцця розных якасцяў. Як від дзейнасці спорт падзяляецца на дзіцяча-юнацкі, масавы, спорт вышэйшых дасягненняў і гэтак далей. То-бок у залежнасці ад умоў і магчымасцяў стаяць розныя мэты і задачы. Спартыўная дзейнасць — падрыхтоўка і ўдзел у спаборніцтвах, і тут прынцыпова важна раздзяліць яго з фізкультурай, хоць гэтыя паняцці вельмі падобныя і блізкія. Для чалавека, які займаецца фізкультурай, галоўная мэта — развіць сябе, але неабавязкова ўдзельнічаць у спаборніцтвах. А ў спартыўнай дзейнасці ў прыярытэце — вынік на спаборніцтвах, нават калі гэта не заўсёды перамога. Удзельнічаць у спаборніцтвах — значыць прайсці адбор, набыць навыкі, некага абыграць і гэтак далей. І натуральна, што ў чалавека, які ўдзельнічае ў турнірах, мяняецца сацыяльны статус. Таму для людзей з абмежаванымі магчымасцямі спорт — выдатны спосаб сацыяльнай адаптацыі, магчымасць праявіць сябе ў сацыяльным жыцці. На жаль, не ва ўсіх сферах жыцця нашага грамадства інваліды могуць арганічна праяўляць сябе разам са звычайнымі людзьмі. Гэты факт аспрэчваць бессэнсоўна. У кожнага існуюць перыяды абмежаваных магчымасцяў: забалела галава — абмежаваны ў інтэлектуальных здольнасцях, зламаў нагу — абмежаваны ў вольным перасоўванні. Проста ў кагосьці гэта часова, а ў кагосьці больш працяглы час ці нават назаўжды.

> **«Іх трэба прымаць такімі, якія яны ёсць, разам з усімі магчымасцямі і абмежаваннямі. Такім чынам людзі дапаўняюць адно аднаго, і так дасягаецца гармонія».**

***— То-бок параалімпійскі спорт — той выпадак, калі галоўнае не перамога, а ўдзел?***

— Чалавек можа не заваяваць медаль Параалімпійскіх гульняў. Але ў спаборніцтве ён пераадолее сябе, пераможа нейкія свае слабасці ці страхі. І элемент дасягнення чагосьці (нават калі гэта проста адбор на спаборніцтвы) заўсёды вельмі важны. Калі чалавек адзін раз удзельнічаў у спаборніцтвах, ён задаволены, усе пераканаліся, што ён можа. Пэўныя сацыяльныя запыты ён задаволіў. Пытанне — ці будзе ён удзельнічаць у спаборніцтвах наступным разам. А калі будзе, дык навошта? Наўрад ці проста дзеля ўдзелу. Наступным разам мэтай будзе паказаць больш высокі вынік, каб абысці сябе леташняга, напрыклад. І гэтак далей.

Элементы сацыяльнай адаптацыі мы назіраем нават па-за спортам: чалавек у сацыяльных сетках можа сябе цалкам упэўнена адчуваць. Вось і сацыяльная адаптацыя — ён у грамадстве, ён актыўна можа весці анлайн-перапіску, вучыцца, працаваць. Свету вядомыя цудоўныя псіхатэрапеўты, прыкаваныя да інваліднага крэсла: Мілтан Эрыксан, напрыклад. Фізік Стывен Хокінг рабіў вялікія адкрыцці. Людзі знайшлі і рэалізавалі сябе ў грамадстве. А спартыўныя спаборніцтвы — гэта і канкурэнцыя з да сябе падобнымі, і саперніцтва з самім сабой. На Алімпійскіх гульнях у Лондане нараўне са здаровымі спартсменамі бег спартсмен на пратэзах. У яго не было задачы выйграць Алімпійскія гульні, гэта было нерэальна. Перад ім стаяла мэта паказаць, што ён можа спаборнічаць. І нельга сказаць, што тое была спроба сацыяльнай адаптацыі. Гэта абсалютна спартыўная гісторыя, калі чалавек вырашыў канкурыраваць з мацнейшымі супернікамі.

> **«Многія добрыя праекты пачынаюцца з таго, што з'яўляецца лідар, фанат, энтузіяст, які ўкладвае ўсю душу і час у свой праект, і вакол яго збіраюцца людзі».**

***— У спартыўных псіхолагаў асаблівая роля ў параалімпійскім спорце?***

— Звычайны псіхолаг, працуючы з параалімпійскай камандай, сутыкаецца са спецыфічнасцю ўзаемаадносін. Тут вельмі важна не пайсці за падсвядомым жаданнем даць слабіну спартсмену. У параалімпійцаў павышаная працаздольнасць, канцэнтрацыя, увага ў тых рэчах, якія яны могуць выконваць. Канешне, у нейкіх аспектах у іх ёсць абмежаванні. І гэтая пераарыентацыя энергіі з аднаго віду дзейнасці на іншы можа прывесці да перагрузкі. І трэба праводзіць мяжу паміж працай і адпачынкам. Аптымальны рэжым для любога чалавека — баланс паміж нагрузкай і аднаўленнем. Часта мы сутыкаемся з праблемай, калі чалавек, дарваўшыся да магчымасці сябе рэалізаваць, перабольшвае. Таму часам псіхолагам даводзіцца працаваць і з матывацыяй спартсменаў-параалімпійцаў. Чалавек, які сутыкнуўся з траўмай, не адразу становіцца параалімпійцам, ён праходзіць дастаткова вялікі перыяд адаптацыі да жыцця. Ён мусіць прыняць тое, што з ім здарылася, прайсці адаптацыю. І пасля гэтага перыяду можна гаварыць аб рэалізацыі сябе ў спартыўнай ці якой-небудзь іншай дзейнасці. Гэта не праблема спорту, гэта вялікая асобная тэма. І калі чалавек з гэтым спраўляецца, то шукае магчымую рэалізацыю ў сваім новым свеце. І параалімпійскі спорт становіцца тым шляхам, па якім чалавек можа вярнуцца ў нармальнае жыццё.

***— А калі чалавек не набыў траўму, а нарадзіўся з такімі асаблівасцямі?***

— На мой погляд, вельмі важна даць дзецям-інвалідам магчымасць займацца спортам. Вядома, узнікае шмат складанасцяў, і фінансавых, і арганізацыйных. І наша грамадства не заўсёды гатовае да такіх людзей. Часам дзіцячае асяроддзе бывае вельмі жорсткім да інвалідаў. І змешваць у адну групу здаровых дзяцей і дзяцей-інвалідаў, на мой погляд, не надта правільна. Трэба праводзіць дадатковую работу для прафілактыкі негатыўных узаемаадносін паміж грамадствам і інвалідамі. Многіх праблем можна пазбегнуць, калі своечасова ўсё прадугледзець.

І я рады, што ў нас ёсць людзі, якія на ўласным прыкладзе гатовы паказаць, што магчымасці кожнага чалавека неабмежаваныя. Проста іх трэба накіраваць у аптымальнае патрэбнае рэчышча. Калі чалавек абмежаваны ў нечым адным, то ён неабмежаваны ў іншым. І вельмі важна знайсці сферу, у якой можна максімальна сябе рэалізаваць.

Вельмі важна весці псіхалагічную работу для бацькоў дзяцей з інваліднасцю. Не ўсе ведаюць, як сябе паводзіць, дзе мяжа паміж шкадаваннем і націскам. Але гэта праблемы не спартыўнай псіхалогіі, а крызіснай і сацыяльнай.

***— Уладзімір Генадзьевіч, на ваш погляд, наша грамадства змяніла сваё стаўленне да інвалідаў?***

— Так, грамадства стала больш талерантным, чым было раней. Гадоў 40 таму параалімпійскаму спорту ніхто столькі ўвагі не ўдзяляў. Параалімпійскія гульні ўзніклі пры жыцці цяперашняга пакалення, а не сто гадоў таму. Нават па нашым грамадстве мы бачым вялізныя змены ў адносінах да інвалідаў. Вядома, хацелася б бачыць іх больш хуткімі. Але лепш ціхай сапай ісці наперад, чым зрабіць рывок і спыніцца. Сваю ролю іграе адсутнасць кадраў, спонсараў, поўнай інфраструктуры. Таму мы павінны арыентавацца на самасвядомасць іншых людзей і менавіта тых, хто акружае людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Ніхто не перашкаджае ім размаўляць, праводзіць час разам, аб'ядноўвацца. Многія добрыя праекты пачынаюцца з таго, што з'яўляецца лідар, фанат, энтузіяст, які ўкладвае ўсю душу і час у свой праект, і вакол яго збіраюцца людзі.

***— Поспехі нашых спартсменаў-параалімпійцаў на гэта ўплываюць?***

— Канешне. Я рады за Ігара Бокія, які непераможны на шматлікіх дыстанцыях, і дзякуй богу, хай так будзе далей. Калі ён прыязджае на спаборніцтвы, усе пачынаюць змагацца за другое месца. Але яму таксама трэба з кімсьці змагацца, і ён змагаецца сам з сабой, са сваімі рэкордамі. Ён не адпачывае на лаўрах, ён працягвае гэтым займацца. Зразумела, што гэта выдатны прыклад для іншых спартсменаў. Вялікую працу праводзіць Аляксей Талай як матывацыйны спікер. Вядома, зараз ён пайшоў нашмат далей, чым астатнія людзі з інваліднасцю. Яго сіла волі не тое што межаў не ведае — яна наогул невымерная. Проста пагутарыўшы з ім, насычаешся энергетыкай, якая праяўляецца ў поглядзе, у дзеяннях. Пакуль мы не навучыліся яе вымяраць і назапашваць. Але яна існуе. І Аляксей — наглядны таму прыклад. І гэта дапамагае ў яго дзейнасці матывацыйнага спікера. Маімі студэнтамі былі чэмпіёны свету па бальных танцах на інвалідных калясках Барыс Бачкоўскі і Вольга Цяцёркіна. Вядома, іх прысутнасць на занятках уплывала на іншых студэнтаў, на іх адносіны да інвалідаў, якія змяняліся ў лепшы бок.

> **«Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі спорт — выдатны спосаб сацыяльнай адаптацыі, магчымасць праявіць сябе ў сацыяльным жыцці».**

***— На жаль, не ўсе ведаюць, як карэктна ставіцца да інвалідаў, каб не пакрыўдзіць, не зачапіць. Дайце, калі ласка, параду, як быць ветлівым у зносінах з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі?***

— Сапраўды, часам мы не ведаем, як ставіцца да інвалідаў: звяртаць увагу на іх асаблівасці ці не, шкадаваць або не варта. І над гэтым таксама трэба шмат працаваць нам усім. Мы ў жыцці не заўважаем свае абмежаваныя магчымасці. Невысокі ростам чалавек не можа дастаць да верхняй паліцы шафы, але ж яго за гэта не шкадуюць. Гэта проста яго абмежаваная магчымасць. Мы цудоўна разумеем, што, калі чалавек нешта не можа зрабіць, ён звернецца па дапамогу. У інвалідаў іншы спектр магчымасцяў і абмежаванняў. І іх трэба прымаць такімі, якія яны ёсць, разам з усімі магчымасцямі і абмежаваннямі. Такім чынам людзі дапаўняюць адно аднаго, і так дасягаецца гармонія.

> **«Наша грамадства не заўсёды гатовае да такіх людзей. Часам дзіцячае асяроддзе бывае вельмі жорсткім да інвалідаў».**

Вядома, варта праяўляць спачуванне да інвалідаў. Лічу, што да кожнага чалавека павінна быць стаўленне добразычлівага нейтралітэту. Не варта навязваць сваю дапамогу. Але калі аб ёй папросяць, трэба быць гатовым аказаць. Калі відаць, што дапамога патрэбна, яе варта прапанаваць. У адносінах паміж людзьмі важна, каб не было навязвання. А на першым месцы каб была гатоўнасць дапамагчы, падтрымаць. Эмпатыя і суперажыванне — абсалютна нармальныя чалавечыя якасці, дэфіцыт якіх адчуваецца сёння асабліва востра.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Вольга МІГДАЛЁВА:

# «ВАЖНА, КАБ У СПОРЦЕ БЫЛА ЎНУТРАНАЯ ЗДАРОВАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ»



**Беларускія спартыўныя рэаліі такія, што практычна ўвесь вялікі спорт засяроджаны ў Мінску. У сталіцы найлепшая інфраструктура, больш трэнераў і магчымасцяў. А што, калі б не было ў іншых гарадах дзіцяча-юнацкіх спартыўных груп, у якіх адданыя сваёй справе трэнеры выхоўваюць маладое пакаленне? Пытанне рытарычнае.**
**Шорт-трэк — амбіцыйны і належным чынам пакуль не раскрыты спорт, таксама імкнецца ў сталіцу. Але яго вытокі — у рэгіёнах, у прыватнасці ў Віцебскай вобласці. Славіцца сваімі традыцыямі і поспехамі Віцебская школа. Не адстае і Аршанская.**
**І, як усюды, усё залежыць ад людзей, здольных развіваць свой спорт. Трэнер па шорт-трэку Вольга МІГДАЛЁВА распавяла «Звяздзе», чым жыве аршанская школа шорт-трэка і што чакае гэты від спорту ў будучыні.**

У 2019 годзе Вольгу Мігдалёву прызначылі галоўным трэнерам нацыянальнай юніёрскай каманды. Але здарылася парадаксальная сітуацыя: з пасады спецыяліст сышла, каб дапамагчы развіццю роднага спорту: «Пабываўшы на шматлікіх міжнародных стартах, убачыўшы, як выступаюць іншыя спартсмены і як нашы, я зразумела, што Беларусь таксама можа выглядаць дастойна. Для гэтага нам усім трэба мяняць сістэму падрыхтоўкі. І я вырашыла, што з юніёрскай каманды пайду, каб сваёй групе праверыць уласнае бачанне працы і сваю сістэму падрыхтоўкі. Я разумела, што не магу рызыкаваць усёй юніёрскай камандай, і ўзяла самаадвод», — тлумачыць Вольга.

> **«Вельмі важна захаваць у вучнях запал і патэнцыял. Я з усіх сіл імкнуся гэта рабіць, але вельмі хочацца падтрымкі ад Беларускага саюза канькабежцаў».**

Трэнер лічыць, што галоўнае ў падрыхтоўцы спартсменаў — рухацца наперад і не баяцца спрабаваць новае. Нельга працаваць па адным шаблоне — такім чынам спартыўных поспехаў не дасягнуць. І вынікі працы такой сістэмы — у пратаколах спаборніцтваў. У мінулым сезоне аршанскія шорт-трэкісты дастойна выступілі на міжнародным старце Baltic Cup, 15-гадовы спартсмен выканаў нарматыў на майстра спорту, яшчэ пяць чалавек сталі кандыдатамі ў майстры спорту.

> **Галоўнае ў падрыхтоўцы спартсменаў — рухацца наперад і не баяцца спрабаваць новае. Нельга працаваць па адным шаблоне — такім чынам спартыўных поспехаў не дасягнуць.**

Цяпер у групе аршанскага спецыяліста каля 20 спартсменаў, працуе яна адна, без памочнікаў. І ў іх падрыхтоўцы трэнер робіць акцэнт на хуткасную вынослівасць. А гэтая база закладваецца летам. Як адзначае Вольга, што летам закладзеш, на тым сезон і праездзіш. Але, на жаль, праверыць закладзеную ўдарным летам базу ў гэтым сезоне будзе складана: пандэмія не дазваляе актыўна выязджаць на замежныя старты. А асноўнай мэтай падрыхтоўкі да сезона былі менавіта міжнародныя турніры. «Мы ўзялі вельмі высокую планку. Спартсмены прадукцыйна папрацавалі летам. Шчыльна супрацоўнічаем з камандай па шорт-трэку Санкт-Пецярбурга. Яны правялі ў нас два вучэбна-трэніровачныя зборы. Да нас на збор прыязджала каманда Калінінграда. І гэта гаворыць аб узроўні», — адзначае трэнер.

## З камандным духам ёсць праблемы

У Оршы шорт-трэк развіваецца з 2014 года. Для горада з вялікай спартыўнай гісторыяй сем гадоў — няшмат. Але за гэты час шорт-трэк стаў тут папулярным. Каля 20 спартсменаў перададзена ў вышэйшае звяно, для школы гэта добры вынік. З кожным годам у секцыі прыходзіць усё больш дзяцей. І часам набор ператвараецца ў адбор. У 2019 годзе ў Спартакіядзе школ Орша была трэцяй, у 2020 годзе — другой. На якое месца аршанцы прэтэндуюць зараз, напэўна, зразумела. Базу гарадской лядовай арэны шорт-трэк дзеліць з хакеем. І ў іх цудоўна атрымліваецца разам існаваць у той час, як многія лядовыя віды спорту скардзяцца, што ўвесь лёд забірае хакей. Вольга Мігдалёва адзначае, што кіраўніцтва арэны ідзе насустрач, справядліва дзеліць лёд і ўсяляк падтрымлівае з абсталяваннем і інвентаром. Адсюль лагічны вынік.



Як бы ні імкнуліся Вольга Мігдалёва і яе вучні, у іх адных не атрымаецца вывесці спорт на якасна новы ўзровень. Патрэбны агульная сістэма і ўнутраная канкурэнцыя. А з гэтым у беларускім шорт-трэку пакуль праблемы. «Сёння варта ўдзяляць увагу дзіцяча-юнацкаму спорту. Важна, каб у спорце была ўнутраная здаровая канкурэнцыя, каб дзецям было цікава спаборнічаць і каб мы маглі іх выгадаваць да дарослага ўзроўню. Сёння ў нацыянальнай камандзе мы трымаем тых спартсменаў, што ў нас ёсць. А калі б іх было чалавек 15 і яны паміж сабой канкурыравалі — вынік стаў бы зусім іншы. Хочацца захаваць нашых дзяцей і падвесці іх да вялікага дарослага спорту», — адзначае трэнер.

Тым не менш Вольга ўпэўнена, што ў найбліжэйшай перспектыве можна вырасціць баяздольную дарослую нацыянальную каманду. Добрыя спартсмены растуць у Жодзіне, Наваполацку, Оршы. Спецыяліст упэўнена, у беларускім шорт-трэку не ўсё страчана: «Цяпер трэба максімум намаганняў прыкласці для захавання рэзерву, юніёраў. Канешне, атрымліваецца не адразу. Павінна прайсці мінімум чатыры гады. Узяць, напрыклад, канькабежны спорт — колькі яго хавалі. Але на пасаду галоўнага трэнера прыйшоў Сяргей Мінін, прайшоў доўгі шлях, прарабіў вялікую працу, і ўжо відаць вынікі. І яны яшчэ будуць, мы зараз бачым толькі пачатак».

І хай шорт-трэк — спорт індывідуальны, для развіцця тут гэтак жа патрэбна каманда з адзіным поглядам. Да таго ж нацыянальная каманда павінна падаваць прыклад маладому пакаленню. «Такое адчуванне, што кожны трэнер, кожная каманда баяцца паказаць адно аднаму, як яны працуюць. І гэта вялікая праблема нашага шорт-трэка. Няма адзінства, вялікай сям'і, а ўсе спаборнічаюць паміж сабой. Канешне, здаровая канкурэнцыя неабходна, але ўсе павінны быць адзінай камандай», — дзеліцца Вольга Мігдалёва. Паводле яе слоў, трэба перагледзець і падыход да трэнерскай працы. Не ўсе спецыялісты хочуць аддаваць сваіх вучняў на наступны ўзровень, бо гэта іх заробак. Нават калі размова ідзе аб юніёрскай зборнай.

## Мы разам расцём і развіваемся



Поспех лёгкіх шляхоў не шукае, спартыўны — тым больш. І нярэдка іх ускладняюць знешнія фактары. Для аршанскай школы шорт-трэка адзін з іх — адток кадраў. Спартсмены заканчваюць школу і з'язджаюць вучыцца ў іншыя гарады. Вучань Вольгі Іван Кісліцын выканаў «майстра спорту», але пасля школы з'ехаў вучыцца ў Мінск, і яго спартыўныя вынікі сталі на паўзу. І такіх прыкладаў можна прывесці шмат. «Гэта вельмі вялікая праблема. Мы гадуем спартсменаў да пэўнага ўзроўню, яны з'язджаюць у Мінск і губляюцца. Максімум можам іх пратрымаць да 11 класа, таму што ў нас у горадзе няма вышэйшых навучальных устаноў. У мяне ў групе займаецца Ілья Дзмітрэнка, вельмі перспектыўны хлопчык, майстар спорту. Але ён заканчвае 11 класаў і з'язджае. Канешне, шкада. Калі б яны мелі магчымасць вучыцца ў Оршы, яны б тут заставаліся, трэніраваліся, умовы ёсць. У будучыні маглі б займацца трэнерскай дзейнасцю. Многія наракаюць, што ў нас мала трэнераў. А спартсмены да 17 гадоў трэніруюцца, з'язджаюць вучыцца, і многія заканчваюць са спортам, проста губляюцца, знаходзяць новыя захапленні. У гэтым плане, нам вядома, цяжка», — прызнаецца трэнер.

Цяпер Вольга Мігдалёва са сваімі вучнямі рыхтуецца да зімовага Еўрапейскага юнацкага Алімпійскага фестывалю, які пройдзе ў сакавіку. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, яны не апускаюць рук. Трэнер гаворыць, што з-пад палкі нікога на спаборніцтвы не заганяе. Спартсмены самі ведаюць, чаго жадаюць, бачаць свае мэты і працуюць для іх дасягнення. У многім дзякуючы прыкладу трэнера. Вольга Анатольеўна прызнаецца: галоўнае для яе — дысцыпліна, парадак і вынік: «Натуральна, жаданне рухацца наперад сваім спартсменам задаю я як трэнер. Працаваць з 20 дзецьмі вельмі няпроста. Яны растуць на маіх вачах, да кожнага трэба знаходзіць падыход, адкрываць матывацыю. Я таксама нямала памылак зрабіла, але мы разам расцём і развіваемся. І калі я бачу іх шчаслівыя вочы, мне больш нічога не трэба. На дадзеным этапе тое, што раблю, — сэнс майго жыцця. Бачу, куды рухаюся, чаго я хачу, і што для гэтага раблю. І спартсмены гэта разумеюць. Некаторыя абяцаюць, што праз чатыры гады будуць на Алімпіядзе. Многія хвалююцца, калі застаюцца без медаля. У іх ёсць асэнсаванне, навошта яны трэніруюцца. Усведамляю, што гадоў у 18 яны змогуць памяняць сваё меркаванне. І вельмі важна захаваць у вучнях запал і патэнцыял. Я з усіх сіл імкнуся гэта рабіць, але вельмі хочацца падтрымкі ад Беларускага саюза канькабежцаў. Жаданне ў дзяцей ёсць, але яго цяжка трымаць, калі няма падтрымкі і стымулу».

> **«Сёння варта ўдзяляць увагу дзіцяча-юнацкаму спорту. Важна, каб у спорце была ўнутраная здаровая канкурэнцыя, каб дзецям было цікава спаборнічаць і каб мы маглі іх выгадаваць да дарослага ўзроўню».**

Аршанская школа сёння — адзін з лідараў беларускага шорт-трэка. І, як заўважае Вольга Мігдалёва, у іх усё нядрэнна. Але ж сутнасць спорту ў тым, каб заўсёды развівацца і станавіцца лепшым.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

## 29 декабря 2021 года проводит 24-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 291 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К-131 в составе: кузов-фургон К-131, № 05166, 1983 г., 4 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 535645, дв. 885461, 1983 г., 4 кат., 2275 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 292 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131, № 0588, 1981 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 442815, дв. 405417, 1981 г., 3 кат., 1328 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 200,00 | 1 240,00 |
| 293 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131, № 06266, 1986 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 692076, дв. 639723, 1986 г., 3 кат., 1499 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 200,00 | 1 240,00 |
| 294 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131Н с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131, № 08441, 1987 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131Н, ш. 758441, дв. 945984, 1987 г., 3 кат., 1200 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 200,00 | 1 240,00 |
| 295 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 07107, 1979 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 352756, дв. 929476, 1979 г., 3 кат., 1580 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 200,00 | 1 240,00 |
| 296 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: кузов-фургон КБ6-131, № 05424, 1981 г., 2 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 444209, дв. 045264, 1981 г., 3 кат., 1518 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 7 950,00 | 1 590,00 |
| 297 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131, № 06589, 1986 г., 4 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 699618, дв. 660660, 1986 г., 3 кат., 1683 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 298 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП, № 39014184, 1983 г., 4 кат., автошасси ГАЗ-66, ш. 0353824, дв. 241709, 1983 г., 4 кат., 2191 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 600,00 | 920,00 |
| 299 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К2-131 в составе: кузов-фургон К2-131 № 04338, 1984 г., 4 кат., автошасси ЗиЛ-131, ш. 582108, дв. 117626, 1984 г., 3 кат., 1370 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 300 | Специальный автомобиль КамАЗ-43106 с кузовом-фургоном К-375 в составе: кузов-фургон К-375 № 02515, 1990 г., 4 кат., автошасси КамАЗ-43106, ш. 0003383, дв. 594796, 1990 г., 4 кат., 6636 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 16 800,00 | 3 360,00 |
| 301 | Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 09371, 1990 г., 4 кат., автошасси КамАЗ-43101, ш. 0020990, дв. 0675161, 1990 г., 3 кат., 1688 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 16 200,00 | 3 240,00 |
| 302 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 229586, 1986 г., 4 кат., автошасси ГАЗ-66-05, ш. 0470650, дв. 200807, 1986 г., 3 кат., 4836 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 200,00 | 840,00 |
| 303 | ПСГ-160(431410) скл. перекачивающая станция горючего с/о 66 на ЗиЛ-431410, ш. 2474090, дв. 599213, 1986 г., 4 кат., 15019 км, 671м/ч | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 304 | ПСГ-160(130) скл. перекачивающая станция горючего с/о 03 на ЗиЛ-130, ш. 2180974, дв. 108001, 1984 г., 4 кат., 1333 км, 642 м/ч | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 305 | Грузовой бортовой Урал-432000-02, ш. 181073, дв. 829534, 1991 г., 4 кат., 70 611 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 10 000,00 | 2 000,00 |
| 306 | Грузовой бортовой Урал-4320-0011-01, ш. 152375, дв. 638104, 1990 г., 4 кат., 75831 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 800,00 | 1 960,00 |
| 307 | Грузовой бортовой Урал-43202, ш. 023205, дв. 586750, 1984 г., 4 кат., 54 740 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 9 800,00 | 1 960,00 |
| 308 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105, ш. 003852, дв. 765362, 1985 г., 4 кат., 96 064 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 309 | Грузовой бортовой КамАЗ-43105, ш. 0010306, дв. 015777, 1986 г., 4 кат., 11 5334 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 310 | Грузовой бортовой КамАЗ-43106, ш. 004869, дв. 0668802, 1990 г., 4 кат., 94 142 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 12 000,00 | 2 400,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 29 декабря 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 24 декабря 2021 года.**

**Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 29 декабря 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел./факсу:**
**(017) 319 35 41, +375(44) 583 77 45.**
**Извещение опубликовано на сайтах:**
**http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/.**

---

## Извещение о проведении 09 декабря 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н, составленному по состоянию на 25.05.2009 года;<br>капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108 общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 куб. м; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106 общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979 общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107 общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986 общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980 общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981, общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982, общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью – 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженностью 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180 общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П» инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695;<br>котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715 |
| Сведения о земельных участках: площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310; площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541 |
| Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43 |
| Начальная цена: 143 494,15 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 14 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

